СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск —6.07, 20.12, 14.05;
Віцебск —5.54, 20.05, 14.10;
Магілёў —5.57, 20.01, 14.04;
Гомель —5.55, 19.57, 14.02;
Гродна —6.21, 20.28, 14.08;
Брэст —6.27, 20.24, 13.57.

МЕСЯЦ:
Першая квадра 16 красавіка.

ІМЯНІНЫ:
Мікіты, Хвядосі;
Бенядзікта, Урбана

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 75 кап.

16 КРАСАВІКА 1992 г.
чацвер, №№ 78—79
(21856—21857)

ВОЗГАЛАС

СУСТРЭЧЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў РЫМЕ

Вечарам 13 красавіка ўрадавая дэлегацыя Беларусі на чале са Старшынёй Савета Міністраў В. Ф. Кебічам наведала рымскую оперу. На флагштоках перад будынкам опернага тэатра ў Рыме былі ўзняты дзяржаўныя флагі — бела-чырвона-белае палотнішча Рэспублікі Беларусь і зялёна-бела-чырвоны флаг Італіі.

У цэнтральнай ложы опернага тэатра разам з беларускай дэлегацыяй знаходзіўся пасол Італіі ў Беларусі Дж. Бертынета, прадстаўнікі палітычных і дзелавых колаў, дзеячы культуры Італьянскай Рэспублікі.

Пасля спектакля адбылася сустрэча беларускай дэлегацыі з прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Рыме.

В. Ф. Кебічу былі прадстаўлены паслы 25 краін свету. У час кароткай гутаркі Старшыня Савета Міністраў нашай рэспублікі адзначыў, што Беларусь адкрыта свету, імкнецца ў сваёй палітыцы строга выконвать нормы міжнароднага права і ў будучым бачыць сябе неад'емнай часткай сусветнага супольніцтва. Паслы пажадалі поспехаў беларускай дэлегацыі ў ходзе візіту ў Італію, а таксама выказалі гарачую зацікаўленасць у поспеху палітычных і эканамічных рэформ у Рэспубліцы Беларусь.

Сустрэчай з дыпламатычным корпусам закончыўся першы дзень афіцыяльнага візіту ўрадавай дэлегацыі Беларусі ў Італію.

У аўторак, 14 красавіка, з самай раніцы картэж аўтамабіляў з членамі беларускай дэлегацыі адправіўся ад гасцініцы «Грандатэль» да цэнтра Рыма — у Ватыкан. Пасля невялікай агляднай экскурсіі па тэрыторыі і музеях Ватыкана пачаліся раней намечаныя перагаворы і сустрэчы.

У рэзідэнцыі вышэйшых кіраўнікоў Рымска-каталіцкай царквы Вячаслава Кебіча і іншых членаў дэлегацыі прыняў дзяржаўны сакратар Ватыкана мансеньёр Анджэла Садана. Адбыліся таксама перагаворы міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пятра Краўчанкі з сакратаром Ватыкана па адносінах з дзяржавамі мансеньёрам Жан-Луі Туранам.

Кульмінацыйным момантам знаходжання ў Ватыкане з'явілася сустрэча Старшыні Савета Міністраў Беларусі Вячаслава Кебіча з кіраўніком Рымска-каталіцкай царквы і дзяржавы Ватыкан папам Іаанам Паўлам II. Папа рымскі пажадаў поспехаў і ўсялякага дабрабыту беларускаму народу, сказаў, што ён моліцца за шчаслівую будучыню шматпакутнай беларускай зямлі, гісторыю якой добра ведае. У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся праблемы ўзаемаадносін паміж Ватыканам і Беларуссю, перспектывы палітычных і эканамічных рэформ у нашай рэспубліцы і іншых краінах СНД.

Беларуская дэлегацыя ўручыла папе рымскаму Іаану Паўлу II факсімільнае выданне Біблії Францыска Скарыны, выпушчанае ў рэспубліцы да 500-годдзя з дня нараджэння вялікага асветніка. Папа рымскі пажадаў поспехаў членам беларускай дэлегацыі і перадаў найлепшыя пажаданні народу Беларусі.

Пасля абеду ўрадавая дэлегацыя Беларусі сустрэлася з кіраўнікамі буйнейшай у Італіі прамыслова-фінансавай групы «Канфундустрыя». Абмеркаваны планы дзелавога супрацоўніцтва ў розных галінах прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці.

Вечарам у рэзідэнцыі ўрадавай дэлегацыі Беларусі адбылася прэс-канферэнцыя для італьянскіх і замежных журналістаў.

15 красавіка дэлегацыя Беларусі накіроўваецца ў Мілан.

Васіль ДРАГАВЕЦ.
Рым, 14 красавіка, па тэлефоне. (БЕЛТА).

У абутковай майстэрні № 12 г. Магілёва заўсёды шмат работы, і не таму, што час цяпер такі цяжкі. Усё значна прасцей: тут працуюць добрыя спецыялісты. Нягледзячы на перабоі ў забеспячэнні матэрыяламі, майстэрня абнаўляе любы абутак. Вось і вырашыў Віталь ЛАЗОВІКАЎ стаць сапраўдным майстрам шавецкай справы. Пакуль ён вучань, але сваю работу любіць і робіць якасна, з душой.

Фота А. КУШНЕРА.

Ці пазбегне прэса парламенцкага прэса?

У апошні час Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь апалчыўся на журналістаў. Ці звязана гэта з вядомым праектам пастановы Вярхоўнага Савета Яўгена Цумарава — пакуль невядома. 15 красавіка раніцай у «Розным» прагучалі цэлыя тры выступленні, прысвечаныя сродкам масавай інфармацыі. Дасталося многім, у тым ліку і галоўнаму рэдактару ўрадавай газеты «Рэспубліка» Мікалаю Керногу.

Аднак самая арыгінальная прапанова прагучала з вуснаў народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь Зінаіды Пяньковай. Яна выказала ідэю правядзення атэстацыі журналістаў у парламенцкіх камісіях. Можа, створым яшчэ і «тройкі» па вызначэнню прафпрыгоднасці журналістаў.

Юрый ВІКТАРОВІЧ.
БелаПАН.

Нас чакае палітычны стрыптыз?

Беларускі парламент, акрамя клопатаў аб рэспубліцы, думаедбае, аказваецца, і пра сябе. І калі дайшла чарга да абмеркавання пытання парадку дня «Аб рэарганізацыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і яго органаў», у зале пасяджэнняў парламента зноў стала горача.

На разгляд народных дэпутатаў былі прапанаваны ажно чатыры праекты законаў. Гэта, здаецца, рэкорд нашага парламента. Свае думкі і меркаванні адносна будучыні Вярхоўнага Савета выказалі Камісія парламента па заканадаўству, апазіцыя Беларускага народнага фронту, дэпутацкае аб'яднанне «Беларусь» і народны дэпутат Васіль Даўгалёў (і гэта таксама адбылося ўпершыню ў гісторыі — няхай пакуль што і не багатай — нашага парламента).

І самі выбраннікі, і запрошаныя на сесію, і мы, журналісты, сыходзіліся на думцы, што ўсе законапраекты — грунтоўныя, узважаныя і рэальныя. Адчувалася, што распрацоўшчыкі папрацавалі над імі, як кажуць, на славу. Таму і адстойванне праектаў было зацікаўленым і дзелавым.

Тое, што Вярхоўны Савет паволі падзяліўся на фракцыі, групы, аб'яднанні, мяркую, нашы чытачы даўно і добра ведаюць. І не будзе для іх сакрэтам тое, што, жадаючы таго ці не, дэпутаты цяпер цягнуць «коўдру» ў свой бок. І калі стала відома, што адзін з праектаў закона падрыхтаваны дэпутацкім аб'яднаннем «Беларусь», сумненняў практычна не было: пройдзе іхні варыянт.

Так яно і атрымалася. Зрабіўшы альтэрнатыўны даклад, дэпутат Мікалай Скарынін даў усім зразумець: праекты камісіі па заканадаўству, апазіцыі БНФ і Васіля Даўгалёва для нас непрымальныя. Маўляў, у выніку рэарганізацыі Вярхоўнага Савета змяняцца палітычныя суадносіны, а ім, прадстаўнікам самай вялікай на сённяшні дзень дэпутацкай групоўкі ў парламенце, гэта не да спадобы. І хоць нямала довадаў гучала потым у зале ў абарону іншых праектаў дакументаў, гэта быў «глас вопиющего в пустыне».

Матэрыялы па разглядаемаму пытанню, унесеныя аб'яднаннем «Беларусь», набралі пры галасаванні патрэбную колькасць галасоў для таго, каб іх прыняць за аснову. На жаль, адсутнасць сёння сучаснай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, сучаснага Закона аб выбарах наўрад ці дазволіць прывесці наш парламент у адпаведнасць з узроўнем перадавых краін Еўропы...

Нямала спрэчак было пры абмеркаванні пытання вакол многіх праблем дзейнасці Вярхоўнага Савета. Скажам, адна з іх: ці маюць права народныя выбраннікі, працуючы на сваёй асноўнай рабоце, займаць яшчэ і пасады ў камісіях? Я асабіста ведаю, што ў большасці дзяржаў свету гэта катэгарычна забаронена. А ў нас такіх дэпутатаў — не адзін дзесятак...

А цяпер некалькі думак народных дэпутатаў:

Сяргей Навумчык:

— Структура Вярхоўнага Савета і камісій рабілася пад структуры галіновых аддзелаў ЦК КПБ з рэфлексамі падпарадкавання, але ніяк не з рэфлексамі кантролю. Такія камісіі, натуральна, ніяк не маглі выпрацаваць тых канцэпцый, якія патрэбны нашай незалежнай Беларусі.

Праект, вынесены апазіцыяй, дае магчымасць у любы момант, любому народнаму дэпутату ажыццявіць увесь аб'ём сваіх заканадаўчых правоў. Права працаваць на прафесійнай аснове ці не працаваць належыць толькі самому дэпутату і нікому іншаму.

(Заканчэнне на 5-й стар.).

ЖЫЦЦЁ ДАРАЖЭЕ...

Павышэнне цэн на асобныя тавары і паслугі каменціруе намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення цэн Дзяржэканомплана А. ГРЭЦКІ

Дзеючыя ў 1 квартале гэтага года цэны склаліся ва ўмовах пастаўкі ў рэспубліку паліўна-энергетычных рэсурсаў па рэгулюемых цэнах, сярэдні ўзровень якіх складаў 448 руб. за тону.

Аднак, пачынаючы з сакавіка, у выніку прынятага Расіяй рашэння аб частковай пастаўцы (да 40 працэнтаў) нафты і газу па свабодных цэнах, узровень цэн на энергарэсурсы ўзрос у сярэднім у 6 разоў. Гэта не магло не адбіцца на эканоміцы рэспублікі.

У гэтых умовах для бястратнай работы Мінэнерга патрабуецца павысіць тарыфы на электрычную энергію амаль у 11 разоў, цеплаэнергію — больш чым у 30 разоў.

У выніку павышэння цэн на нафту ўскладняецца становішча ў аграпрамысловым комплексе, дзе на падтрыманне нізкіх цэн на хлеб і хлебабулачныя вырабы, малако і малакапрадукты, мяса, вараныя каўбасы і дзіцячае харчаванне ў 1 квартале накіравана 6 мільярдаў рублёў. Пастаўка 40 працэнтаў энерганосьбітаў па свабодных цэнах даводзіць размер гэтай датацыі толькі на красавік да 3 мільярдаў рублёў.

Рост затрат на паліва і энергарэсурсы, рэзкае павелічэнне цэн на рухомы састаў і запасныя часткі (да 50 разоў), аўтамашыны (больш чым у 10 разоў), пастаўляемыя з-за межаў рэспублікі, выклікае неабходнасць павышэння тарыфаў на праезд у гарадскім транспарце. Разлікі паказалі, што для нармальнай гаспадарчаразліковай дзейнасці прадпрыемстваў гарадскога пасажырскага транспарту іх дзеючы ўзровень (40 кап. за 1 паездку) неабходна павялічыць па аўтобусу ў 11,5 раза; тралейбусу, трамваю — 8,6 раза, метрапалітэну — 7,2 раза, г. зн. адпаведна ўстанавіць 5 руб. 10 кап., 3 руб. 34 кап. і 2 руб. 90 кап. Пры захаванні ж дзеючых тарыфаў неабходна прадугледзець дадатковае бюджэтнае фінансаванне гарадскога транспарту ў размеры 5,7 мільярда рублёў у разліку на год. Павелічэнне тарыфу ў 2,5 раза (на ўсе віды транспарту да 1 руб. за 1 паездку) запатрабуе выдзялення дадатковых сродкаў з бюджэту ў размеры 4 мільярды рублёў. Аналагічная сітуацыя складваецца і па перавозках пасажыраў у прыгарадных і міжгародніх зносінах.

Рост цэн на паліўна-энергетычныя рэсурсы вядзе таксама да рэзкага павелічэння расходаў у сферы камунальнага і бытавога абслугоўвання.

Паводле разлікаў, затраты па абслугоўванню жыллёвага фонду, водаправода і каналізацыі ўзрастуць у 18—25 разоў супраць платы, якая цяпер атрымліваецца ад насельніцтва. Павышэнне ў тры разы платы за водаправод, цепла- і электраэнергію, каналізацыю дасць магчымасць зменшыць націск на бюджэт на 550 млн. руб. у разліку на год. Аднак больш за 3 млрд. руб. на дацiраванне ўказаных паслуг толькі ў сістэме Міжвылкамунгаса павінна быць адшукана з бюджэту.

Аналагічнае становішча і з рэалізацыяй медыкаментаў. Прапануемае падвоенне іх кошту не знімае праблемы дацiравання. Паводле нашых ацэнак, у бюджэце трэба адшукаць на гэтыя мэты больш за 1,5 млрд. руб. Зразумела, што ўрад не мог пайсці на ўстанаўленне цэн на бездатацыйным узроўні, але і захаваць узровень дзеючых цэн, тарыфаў на асобныя тавары і паслугі немагчыма. Дарэчы, аналагічныя тавары і паслугі ў суседніх дзяржавах каштуюць насельніцтву значна даражэй. Гэта датычыць гарэлкі, медыкаментаў. У суседзяў на датацыі ўзята толькі натуральнамалочная прадукцыя, у нас жа масла, смятана, вяршкі, тварог, усе асноўныя масавыя віды хлеба, батоны наразныя з мукі вышэйшага і першага гатункаў, а таксама камунальныя паслугі.

ДЛЯ АЎТА- І ТЭЛЕАМАТАРАЎ

ГРОДНА. (А. Дук). На аб'яднанні «Хваля» распрацаваны і асвоены ўзоры новай прадукцыі: аўтамабільнае процiўгонное прыстасаванне «Сігнал» і комплекс абсталявання кабельнага тэлебачання «Кіпарыс». Ахоўная сігналізацыя будзе аснашчана радыёканалам дыстанцыйнай сувязі з гаспадаром аўтамабіля. Першая партыя з 65 прыстасаванняў праходзіць зараз выпрабаванні.

Ідзе падрыхтоўка да вытворчасці больш дасканалага комплексу абсталявання кабельнага тэлебачання «Колас» са зваротным каналам сувязі ад абанента.

У ПРЭЗІДЫУМЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСІ

У Доме ўрада адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі. Асноўнае пытанне парадку дня — аб рэспубліканскіх комплексных праграмах «Цукар» і «Алей», разлічаных на 1992—1995 гады і на перыяд да 2000 года.

У дакладзе, з якім выступіў міністр сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання Ф. Мірачыцкі, былі прааналізаваны прычыны вострага дэфіцыту гэтых прадуктаў, вызначаны асноўныя напрамкі работы па нармалізацыі абстаноўкі. У прыватнасці, прадугледжваецца расшырэнне пасяўных плошчаў пад цукровыя буракі з 44,7 тысячы гектараў у 1991 годзе да 53,1 тысячы ў 1995 і 75,5 тысячы к 2000 году, а пад алейныя культуры, у першую чаргу рапс,— з 51 тысячы гектараў да 160 тысяч. Плануецца забяспечыць рэзкі рост вытворчых магутнасцей па выпуску гэтых прадуктаў харчавання як за кошт будаўніцтва новых перапрацоўчых прадпрыемстваў, так і рэканструкцыі існуючых.

Па дакладу і прадстаўленых дакументах удзельнікамі пасяджэння быў выказаны рад істотных заўваг. Звернута ўвага на надзвычайную часавую зацягнутасць праграм. Як сказаў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў рэспублікі М. Мясніковіч, які вёў пасяджэнне, цукар, алей патрэбны цяпер, да 2000 года насельніцтва чакаць не можа. Адзначалася таксама, што ў праграме «Цукар», напрыклад, няма дакладных мер па зніжэнню душавога спажывання гэтага прадукта, якое ў нас усё яшчэ вышэй, чым у многіх развітых дзяржавах, па рацыянальнаму яго выкарыстанню, асабліва ў харчовай прамысловасці, па больш шырокаму прымяненню цукразамяняльнікаў. Указвалася на неабходнасць больш актыўна запазычваць вопыт зарубежных краін, смялей ісці з імі на супрацоўніцтва і кааперацыю.

Прэзідыум Савета Міністраў прыняў рашэнне скарэкціраваць праграмы «Цукар» і «Алей» з улікам выказаных заўваг і прапаноў.

На пасяджэнні разгледжаны некаторыя іншыя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Афіцэралогія

Што адбываецца сёння з арміяй? Гэта пытанне хвалюе ўсіх. Але хто здольны адказаць на яго?

Інстытут сацыялогіі АН Рэспублікі Беларусь правёў апытанне: «Армія: праблемы і перспектывы». У ім прынялі ўдзел 268 афіцэраў Беларускай ваеннай акругі і ўнутраных войск МУС РБ.

Як лічаць афіцэры, якія праходзяць службу ў рэспубліцы, найбольшую заклапочанасць сёння выклікае дрэннае вырашэнне сацыяльных пытанняў (гэта адзначылі 68,7 працэнта апытаных), недакладнасць лёсу Узброеных Сіл (64,2), адсутнасць сацыяльнай абароненасці (64,2), недастатковая заработная плата (64,2).

У канцы мінулага года людзей у пагонах хваляваді перш за ўсё праблемы стабільнасці грамадства, рэзкае пагаршэнне адносін паміж рознымі рэспублікамі краіны. Пасля развалу Саюза ССР, бяздумнага павышэння цэн пры згортванні вытворчасці і абнішчанні мільёнаў людзей і ў армейскім жыцці на першыя месцы выйшлі сацыяльныя праблемы, недастатковая заработная плата, адсутнасць рэальнай сацыяльнай абароны. На думку афіцэрскага корпуса, у цяперашніх умовах на цывільнай пасадзе можна атрымаць намнога больш значную заработную плату пры больш лёгкіх умовах працы. Сярод афіцэраў унутраных войск на адно з першых месц выйшла праблема адсутнасці асабістай бяспекі (гэта адзначылі 83,7 працэнта рэспандэнтаў — афіцэраў УВ). У апошнія гады істотна павялічылася злачыннасць, як у грамадстве ў цэлым, так і ў выпраўленча-працоўных установах. Аднак заканатворчыя органы рэспублікі не спяшаюцца прымаць неабходныя і чакаемыя ў грамадстве і войсках законы.

Крызіс у грамадстве адбіўся і на сацыяльна-псіхалагічнай абстаноўцы ў арміі. Толькі 8,2 працэнта афіцэраў лічаць, што клімат у арміі за апошні год палепшыўся. У той жа час, на думку трох з чатырох апытаных, ён пагоршыўся. У адной з анкет чытаеш: «баюся гаварыць за ўсю армію. Можа і ёсць дзе добрыя аазісы. Але тое, што бачаць вочы і адчувае душа — агідна!» Гэты вывад пацвярджае і той факт, што 83,6 працэнта рэспандэнтаў адзначылі: за апошні год у іх армейскім жыцці наогул не было падзей, якія радавалі б. Некаторых афіцэраў абрадаваў вывад войск СНД з Нагорнага Карабаха, утварэнне афіцэрскага сходу, адстаўка М. С. Гарбачова і г. д. Называліся таксама асабістыя прычыны — прысваенне чарговага звання, атрыманне кватэр і г. д.

Падзей, якія абурылі ваеннаслужачых, значна больш. Больш палавіны афіцэраў указалі, што самым страшным для іх у мінулым годзе стаў распад Саюза і развал Савецкай Арміі. Называліся і іншыя сумныя падзеі. Сярод іх:

— разгон дэманстрацыі працоўных, у тым ліку афіцэраў, 23 лютага гэтага года ў Маскве;

— удзел арміі ў жнівеньскіх падзеях мінулага года;

— звальненне з радоў арміі афіцэра, які патрабаваў адстаўкі маршала Шапашнікава;

— прыняцце прысягі па «нацыянальных кватэрах»;

— абыякавасць улад усіх узроўняў, асабліва верхняга эшалона, да гібелі ваеннаслужачых у міжнацыянальных канфліктах і г. д.

Некаторыя сродкі масавай інфармацыі сцвярджаюць, што афіцэры матэрыяльна добра забяспечаны і жывуць прыпяваючы. Гэта міф. Сацыялагічныя даследаванні паказалі, што ўзровень дабрабыту людзей у пагонах ва ўмовах пераходу да рынкавай эканомікі вельмі недастатковы. Камандзір узвода працуе па 16 гадзін у суткі, практычна не мае выхадных, а атрымлівае менш за вадзіцеля або грузчыка. Толькі 2,2 працэнта апытаных афіцэраў жывуць у дастатку, 53,7 працэнта — ад зарплаты да зарплаты, 37,3 працэнта не зводзяць канцы з канцамі, 6,8 працэнта заўсёды ў даўгах.

Высветлілася, што Узброеныя Сілы гатовы да актыўных метадаў пратэсту (мітынгаў, дэманстрацый, забастовак і г. д.). Гэта сцвярджалі 60,4 працэнта рэспандэнтаў. Толькі чвэрць апытаных афіцэраў лічыць, што нельга парушаць армейскую дысцыпліну, 14,2 працэнта вагаліся, аднак тэндэнцыі паказваюць, што ў бліжэйшы час яны хутчэй за ўсё падтрымаюць актыўныя формы пратэсту.

Больш як дзве трэці рэспандэнтаў не сталі б афіцэрамі, каб цяпер з'явілася магчымасць зноў выбіраць жыццёвы шлях. «Сапраўдныя афіцэры сёння нікому не патрэбны»,— гаворыцца ў адной з анкет. Так хутка армія можа наогул застацца без афіцэраў. Толькі менш чвэрці апытаных гатовы былі б зноў надзець афіцэрскія пагоны. З кожным днём іх колькасць змяншаецца.

А якія шляхі вырашэння армейскіх праблем? З прапанаваных адказаў афіцэры выбралі наступныя:

— прыняць адпаведныя законы аб сацыяльнай абароне афіцэраў і звольненых у запас — 62,7 працэнта;

— стварыць кіраўнічыя і камандныя структуры нацыянальнай арміі — 4,5 працэнта;

— сфарміраваць структуру войск СНД — 20,1 працэнта.

Дарэчы, суадносіны апошніх двух пунктаў яшчэ раз сведчаць аб тым, што людзей у пагонах, якія падтрымліваюць армію СНД, прыкладна ў пяць разоў больш, чым тых, хто выступае за стварэнне нацыянальнай арміі Рэспублікі Беларусь.

Ёсць пажаданні афіцэрскага корпуса Вярхоўнаму Савету і ўраду Рэспублікі Беларусь. На іх думку, дэпутаты не заўсёды правільна ацэньваюць сітуацыю, спазняюцца з прыняццем практычна і сацыяльна адказных рашэнняў. Рэспандэнты лічаць, што неабходна неадкладна прыняць закон аб статусе і сацыяльнай абароне ваеннаслужачых, тэрмінова распрацаваць канкрэтныя меры па працаўладкаванню і перакваліфікацыі афіцэраў, падрыхтоўцы да стварэння Узброеных Сіл на кантрактнай аснове.

І. КАТЛЯРОЎ,
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі АН РБ, доктар сацыялагічных навук.

СУД СКОНЧЫЎСЯ. НАПРУЖАННЕ НЕ СПАЛА

Чатыры разы збіраліся калійшчыкі Салігорска ў зале абласнога суда, дзе разглядалася справа па іску адміністрацыі вытворчага аб'яднання «Беларускалій» да выканаўчага бюро Незалежнага прафсаюза гарнякоў Беларусі і прафкома прафсаюза хімікаў прадпрыемства. Адміністрацыя падала заяву ў суд на незаконнасць забастоўкі шахцёраў, арганізаванай прафсаюзамі. І суд у канчатковым выніку прызнаў яе незаконнай па прычыне парушэння некаторых артыкулаў Закона аб вырашэнні працоўных спрэчак (канфліктаў).

Суд вынес таксама прыватную пастанову ў адносінах да адміністрацыі аб'яднання «Беларускалій» і накіраваў яе на адрас вышэйшай арганізацыі — Дзяржкампрама. Гэтай пастановай суд ускладае адказнасць за забастоўку і на адміністрацыю ВА. Таму што фактычна забастоўка насіла папераджальны характар і ўсім было вядома, што, калі не будзе вырашаны канфлікт паміж прафсаюзамі і адміністрацыяй, які ўзнік з-за недамоўленасці наконт тарыфных ставак і паправачнага каэфіцыента, ён выльецца ў забастоўку.

Суд скончыўся. Рашэнне прынята. Але наўрад ці змогуць людзі сёння ж выйсці на работу. Прычына, па словах некаторых лідэраў прафсаюзаў, у тым, што цяжка будзе сабраць так хутка людзей, аб'явіць ім рашэнне суда. Мітынг у Салігорску назначаны на пятніцу, 17 красавіка. Частка калійшчыкаў знаходзіцца ў Мінску. Учора яны пайшлі на прадпрыемства горада. Расказвалі пра справы на «Беларускалі» і запрашалі на мітынг, які павінен адбыцца сёння а 17 гадзіне на плошчы Незалежнасці ў Мінску.

Галадоўка на плошчы Незалежнасці працягваецца. Тут я сустрэла сакратара-казначэя НПГБ Аляксандра Доўнара, які, на маё пытанне, на якіх умовах гарнякі спыняць забастоўку і выйдуць на работу, адказаў:

— Для гэтага трэба, каб на прафсаюзы не быў пададзены ў суд іск на пакрыццё страт, прычыненых прадпрыемству забастоўкай, каб было падпісана часовае пагадненне і абавязкова прыехаў на аб'яднанне прадстаўнік уласніка (Дзяржкампрама) для тлумачэння гэтага пагаднення, а генеральны дырэктар «Беларускалію» пайшоў у адстаўку.

Але А. Доўнар падкрэсліў, што гэта яго асабістая думка.

Учора на аб'яднанні «Беларускалій» у першай палавіне дня да работы не прыступалі.

Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

ГІПС НЕ ВЫТРЫМЛІВАЕ

ОРША. Гарвыканком прыняў рашэнне знесці два помнікі Леніну ў гарадскіх парках.

Рашэнне матывуецца недаўгавечнасцю матэрыялаў (гіпс і бетон), з якіх выраблены помнікі, у выніку чаго яны патрабуюць рэгулярных рэстаўрацыйных работ.

РІД.

СЫДУЦЦА Ў РУКАПАШНЫМ

Нарэшце мінчане змогуць не толькі паглядзець на розныя віды адзінаборства, але і навучыцца ім.

Навукова-практычны цэнтр «Пярун» арганізуе першы дзесяцітыднёвы вучэбна-трэніровачны семінар па айчыннаму рукапашнаму бою. Пройдзе ён з 15 па 25 мая на базе алімпійскага спартыўнага комплексу «Стайкі». У вучэбнай праграме семінара—лекцыі, відэаматэрыял, вывучэнне тактыкі вядзення бою, абароны ад зброі, метады выжывання ў экстрэмальных умовах, спецыяльная акрабатыка і многае іншае.

БелаПАН.

Мама, прадай мяне за мяжу...

Белтаўская інфармацыя «І трэці — не лішні», якая «прайшла» па старонках рэспубліканскага друку, умільна-саладжава паведамляе пра тое, што выхаванцы Магілёўскага дзіцячага дома «Аня і Таня адчуваюць сябе шчаслівымі, займеўшы, нарэшце, не казённы, а родны (разрадка мая — Я. Ц.) дом». Гаворка ідзе пра дзяцей, якія разам з іншымі ў снежні 1990 года былі вывезены з ласкі Мінскай дабрачыннай арганізацыі «Отклік» і з дазволу Міністэрства адукацыі Беларусі на аздараўленне ў польскія сем'і. Але, калі скончыўся тэрмін знаходжання на чужыне, некалькі дзяцей, выхаванцаў Магілёўскага дзіцячага дома, засталося ў Польшчы па волі яе гасцінных грамадзян і са згоды педагагічных і адміністрацыйных работнікаў адпаведных арганізацый і ведамстваў Рэспублікі Беларусь.

З таго часу было шмат камандзіровак па розных мясцінах Польшчы (з аплатай у валюце) «дзядзяў» і «цёцяў» з шэрагу устаноў Беларусі, якія, аднак, аказаліся марнымі — маўляў, дзеці ў Польшчы сытыя і шчаслівыя...

Відавочна, трэба аддаць належнае і шчыра падзякаваць за ласку і спагаду да беларускіх дзяцей польскай сям'і з горада Торуні, а таксама іншым зычлівым грамадзянам замежных краін за іх клопат пра «чарнобыльскую» рэспубліку. Аднак ніякай ласкай нельга апраўдаць тых, хто забыўся, што гэта дзеці беларускія, у якіх ёсць радзіма і ёсць родная зямля, якая ім належыць і іх чакае, а, магчыма, ёсць і жывая маці, ёсць, нарэшце, радавод. Цывілізаваны свет такога не бачыў, каб дзеці па волі (а можа, і за срэбранікі?) якіхсьці «дзядзек» і «цётак» былі пазбаўлены асновы жыцця — Бацькаўшчыны. Галосна, на вачах усёй грамадскасці! Ды яшчэ з ухвалай і, здаецца, не без шкадавання пра тое, што такога «шчаслівага» лёсу не выпала іншым бедным беларускім хлапчукам і дзяўчынкам... Глядзіш, якое дзіцятка паглядзіць на клапатліва растыражыраваныя ў газетах «сямейныя» здымкі магілёўцаў Ані і Тані ў шыкоўных торуньскіх інтэр'ерах, ды і выгукне тыя нядобрыя словы, якія вынесены ў загаловак...

Але чаму маўчыць Улада? Чаму не стогне ў адчаі Маці? Чаму бяздзейныя Мы?.. Можа гэта праклён грамадству — куды ўжо далей, прыйшлі...

Другі год жывуць на польскай зямельцы беларускія дзяўчынкі Аня і Таня. Іх лёс, на думку аўтараў белтаўскай карэспандэнцыі, прадвызначаны, нягледзячы на тое, што па сястрычцы Тані ўжо, бадай, перастаў плакаць — бо, верагодна, забыўся пра яе — малодшы брацік, відаць, таксама выхаванец Магілёўскага дзіцячага дома. Але, кажуць бадзёра белтаўцы, — нічога, і яго чакае польская сям'я (гл. загаловак: «І трэці — не лішні»). І яго «мараць усынавіць» зычлівыя людзі з-за мяжы. Дзякуй ім! Але хіба ад дзяўчынак адмовілася Радзіма? Па якому закону і маральнаму праву іх ужо тосьці «ўсынавіў»?

«Восенню Аня пойдзе ў прыватную школу. Кошт навучання ў ёй немалы, але дзяўчынка будзе вывучаць польскую і дзве замежныя мовы (разрадка мая — Я. Ц.), музыку, камп'ютэры...» Злітуйся, Божа, каб сярод гэтых замежных моў не была родная (беларуская? руская? яўрэйская?..)!

Цяжка прыдумаць больш вытанчаны здзек над маладой незалежнай Беларуссю. Чаго варта Дзяржава, якая не толькі не хоча, але і не мае жадання абараніць сваіх грамадзян, непаўналетніх дзяцей. Не-не, ды і «прыходзіць» думка, што ўся гэта адмысловая гісторыя здарылася — пры ўсёй павазе да добрых польскіх грамадзян — не сама сабою. Трэба камусьці так «падсуседзіцца» да «браткоў»-беларусаў, каб ім не схацелася больш ні волі, ні незалежнасці, ні беларускасці. Каб жылі так, як жылі,—пустадомкамі ды бяздроднымі Іванамі і Янамі.

Яўген ЦУМАРАЎ,
народны дэпутат Рэспублікі Беларусь.

У БЕЛАРУСАЎ БЕЛАСТОЧЧЫНЫ

МЫ ГАВОРЫМ «ХАЙНУЎКА», ПАДРАЗУМЯВАЕМ — «ГАЙНАЎКА»

Палякі называюць яе Хайнуўкай, беларусы — Гайнаўкай. Тыповы гарадок на прыгранічных землях, якія тут называюць «усходняй сцяной». Адразу за гарадской ускраінай шумяць векавыя сосны — пачынаецца Белавежская пушча, што цягнецца аж да беларускай граніцы (да яе ад Гайнаўкі 23 кіламетры) — і далей, на наш бок, да Камянца і Свіслачы.

«Усходняя сцяна» — край асаблівы. Тутэйшыя землі лічацца самымі неўрадлівымі ў Польшчы. Сяляне пакідаюць вёскі хутчэй, чым у іншых мясцінах. І жывуць мясцовыя жыхары, як агульнапрызнана, — больш сціпла і бедна, чым у цэнтры ці на поўдні Польшчы.

Але асаблівасць Беласточчыны — не толькі ў гэтым. У апошні час у польскай прэсе нямала пішуць пра пасляваенны час, калі беларусы нібыта прычыніліся да перамогі камуністаў, падтрымалі новы рэжым і гэтым выклікалі на сябе рэакцыю польскай апазіцыі, «акаўцаў». У час супрацьстаяння часта цярпелі людзі невінаватыя, — і ўспаміны пра тыя жорсткія гады дагэтуль жывуць у беластоцкіх вёсачках і спрыяюць той дыстанцыі, якая не-не ды і праяўляецца ў адносінах паміж беларусамі і палякамі, праваслаўнымі і каталікамі.

Тут, на ўсходзе Польшчы, ніколі не імкнуліся да забастовак. Цяпер таксама абыходзяцца без пратэстаў, хоць жыццё не песціць і не дае вялікіх надзей на блізкую будучыню. Праўда, павярхоўны позірк на запоўненыя заходнімі таварамі паліцы магазінаў схіляе не столькі да расчаравання, колькі да аптымізму (асабліва пасля рэалій Беларусі). Але размовы з тутэйшымі жыхарамі міжволі пераконваюць, што жыццё большасці людзей мала падобнае на яркія стракатыя вітрыны.

«Жыццё становіцца цяжэйшым, а мы не разумеем нават — чаму. Падзенне вытворчасці на прадпрыемствах, банкрутства ПГР-аў (аналаг нашых саўгасаў — аўт.), нізкія прыбыткі ў сельскай гаспадарцы прывялі да таго, што мы адчулі рэальнае пагаршэнне жыцця. У нашых вёсках і мястэчках ужо цяпер прыкладна больш яек палавіна жыхароў — пенсіянеры і беспрацоўныя. Непакоіць становішча моладзі, — з аднаго боку, недахоп грошай (у кожнай сям'і, але перш за ўсё ў дзяржаве), а з другога — адсутнасць хоць якіх-небудзь перспектыў пасля заканчэння школы прыводзяць да таго, што ўсё менш моладзі вучыцца ў ліцэях і тэхнікумах. На вучобу рашаюцца адзінкі». Так пра становішча беларусаў Беласточчыны піша ў апошнім нумары «Czasopisa» публіцыст Ежы Хмялеўскі ў нататцы пад красамоўнай назвай «Лямант усходняй сцяны». Нататку ілюструе фотаздымак тыповага краявіду: кінутая занядбаная хатка пад саламянай страхой сярод задзірванелай сядзібы.

Зрэшты, усё пазнаецца ў параўнанні. І тое, што па еўрапейскіх ці нават польскіх мерках выглядае амаль трагічна, вачыма госця з Беларусі бачыцца часта зусім інакш. Прырэдкіх хмызняках вялікі, галоў на трыццаць, статак зубраў, што падаэрона паглядалі на наш ярка-чырвоны лімузін.

Падабенства канчаецца, калі бачыш вялізныя лесасекі, абшары пушчы, перарэзаныя вузкакалейнымі чыгункамі, лесавозы, гружаныя таўшчэзнымі бярвеннямі. У адрозненне ад нашага боку, у Польшчы нацыянальным паркам аб'яўлена толькі невялікая частка пушчы. А пакуль ідуць размовы аб частку Польшчы і Беласточчыны, як адну з самых экалагічна чыстых у краіне. Зрэшты, на тым баку мяжы «зялёныя лёгкія» таксама не азонам напаўняюцца, — варта адзін гродзенскі «Азот» прыгадаць.

Але наша размова з бургамістрам Мечыславам Гмітэрам менш за ўсё датычыла эканомікі. Беларусы і палякі ў Гайнаўцы, — што іх розніць і што яднае, ці здараюцца канфлікты на нацыянальнай глебе? — пра гэта зайшла гутарка.

— Пан Гмітэр, ці шмат беларусаў у Гайнаўцы?

— Дакладная колькасць беларусаў у нашым горадзе і гміне, як і ва ўсёй Польшчы, невядомая, — у час перапісу ў РП не збіраліся звесткі пра нацыянальнасць. Даводзіцца арыентавацца па веравызнанню: ёсць 50 працэнтаў жыхароў Гайнаўкі праваслаўныя, каля 40 — каталікі. Хоць гэтыя лічбы толькі прыблізна адлюстроўваюць нацыянальны склад, бо многія праваслаўныя лічаць сябе палякамі.

— Мне даводзілася чытаць, што праваслаўная царква з прахалодай ставіцца да беларускасці: многія яе высокапастаўленыя прадстаўнікі публічна заяўляюць аб тым, што яны палякі. У той жа час беларуская прэса тут, у Польшчы, іранізуе з гэтай нагоды, — маўляў, усе гэтыя палякі, за рэдкім выключэннем — родам з беларускіх вёсак Падляшша.

— Цяжка быць суддзёй у такіх спрэчках. І ўсё ж наўрад ці варта вызначаць нацыянальнасць па веравызнанню, — заганнасць гэтага прынцыпу, здаецца, вы ў сябе ў Беларусі самі добра адчулі. Мяркую, сам чалавек павінен мець права вызначыцца ў гэтай далікатнай справе. І гэта права на выбар трэба паважаць.

— Ці даводзілася сутыкацца з канфліктамі, непаразуменнямі на нацыянальнай глебе?

— Значных канфліктаў не прыпомню. Размежаванне ўзнікае звычайна ў час выбараў: тады дзве найбольшыя нацыянальныя групы актывізуюцца, вылучаюць кожная сваіх кандыдатаў і ўспамінаюць пра тое, што адрознівае адну ад другой. Як правіла, вялікай перавагі ні адна з груп не дабіваецца. Для прыкладу, у цяперашняй гмінай радзе 14 радных — беларусы і 14 — палякі.

Мінае некалькі сесій — і пра рознагалоссі ўсе забываюць. Калі займаешся канкрэтнымі гаспадарчымі праблемамі, менш за ўсё думаеш пра нацыянальнасць таго, хто працуе побач з табой. Бадай, найлепшы прыклад таго, што адносіны паміж людзьмі розных канфесій і нацыянальнасцей добразычлівыя — даволі значная колькасць змешаных шлюбаў.

— «Czasopis», пішучы аб змешаных шлюбах, канстатуе, што стварэнне такіх сем'яў амаль у ста працэнтах выпадкаў азначае пераход вернікаў з царквы да касцёла.

— Гэта справа канкрэтных людзей, іх выбару. Хоць, сапраўды, часцей здараецца так, што змешаныя пары выбіраюць касцёл, а не царкву. Я не бачу ў гэтым нічога страшнага і надзвычайнага: галоўнае, каб у дачыненні да выбару маладых не было ніякага ціску.

— У Беларусі Гайнаўку ведаюць найперш па Музею беларускай культуры, які ўжо даволі значны час будуецца ў вашым горадзе. Гарадскія ўлады спрыяюць гэтаму будаўніцтву?

— На жаль, наша дапамога абмяжоўваецца ў асноўным маральнай падтрымкай, — гарадская казна не такая багатая, каб падтрымліваць вялікую будоўлю. Камітэт па будаўніцтву мае цяпер цяжкасці, — зроблена нямала, але наперадзе яшчэ столькі работы, што сродкаў спатрэбіцца дужа шмат. Думаю, праблемы будуць і ў далейшым — з утрыманнем такога вялікага па маштабах Гайнаўкі будынка.

— Гайнаўская гміна — прыгранічная. Не трывожаць клопаты, звязаныя з турыстычным бізнесам грамадзян, якія прыязджаюць з таго боку мяжы?

— Клопаты ёсць, але трывогі яны не выклікаюць: гэта нармальная сітуацыя для краін, якія перажываюць пераход ад адной грамадска-палітычнай сістэмы да другой. Вашы грамадзяне наведваюць наш рынак таннымі таварамі, прымушаючы гэтым самым знижаць цэны нашых камерсантаў, — што ў гэтым кепскага? Іншая справа, што часам гэты гандаль не ўпісваецца ў існуючыя правілы: парушаюцца санітарныя нормы пры продажы прадуктаў харчавання, — асабліва мясных вырабаў, турысты, нягледзячы на забарону, гандлююць алкаголем, — часта не самай высокай якасці.

...Мы развіталіся з Гайнаўкай-Хайнуўкай дажджлівым вясновым вечарам. За вокнамі аўтобуса мільгануў мадэрновы сілуэт нядаўна пабудаванай па моднаму праекту царквы, яркая вітрына магазінчыка садавіны і гародніны, дзе можна купіць бананы, ананасы і экзатычныя для нас плады ківі. Потым — ужо зусім па-беларуску — буслянка на старой бярозе і драўляная сціплая хата пад шыферным дахам, ашаляваная і пафарбаваная ў яркія колеры.

«Ужо не Беларусь, яшчэ не Польшча», — падумалася.

Валянцін ЖДАНКО.
Беластоцкае ваяводства.

ІНТЭРВ'Ю, ЯКОГА НЕ БЫЛО

НЕКАЛЬКІ ПЫТАННЯЎ ДА МІНІСТРА ГАНДЛЮ

Так, сапраўды, інтэрв'ю не было. Не хачу падманваць чытачоў. Не сядзелі мы з міністрам гандлю Рэспублікі Беларусь В. Байдаком адзін насупраць аднаго ва ўтульных крэслах, не беглі хвіліны ў цікавай гутарцы, не стракатаў ледзь чутна дыктафон і не абносіла гасцінная сакратарка міністра кавай у маленькіх кубачках. Не было гэтага.

А было вось што.

Калі вакантная на працягу даволі доўгага часу пасада міністра гандлю нарэшце аказалася занятай, я амаль адразу атрымаў даручэнне рэдактара пагутарыць з новым членам урада. Спачатку Валянцін Іванавіч паабяцаў на ўсе пытанні адказаць на сваёй прэс-канферэнцыі, але прэс-канферэнцыя аказалася надзвычай нецікавай, і давялося зноў дакучаць міністру просьбамі аб сустрэчы. Толькі сустракацца з карэспандэнтам «Звязды» В. Байдак не пажадаў. Праз свайго памочніка А. Мельніка ён перадаў, што ў бліжэйшай і не вельмі будучыні ў яго для мяне не знойдзецца нават паўгадзіны. А ў якасці «кампенсацыі» прапанаваў адказаць на пытанні пісьмова.

Трэба сказаць, што ў часы партнаменклатурнага панавання такая форма напісання «інтэрв'ю» была дволі распаўсюджанай. Карэспандэнт завозіў свае пытанні, скажам, сакратару абкома альбо ЦК, а над адказамі на іх працаваў увесь апарат. Потым сакратар урачыста ставіў свой подпіс на апошнім машынапісным аркушы.

Першай маёй думкай было ад прапановы міністра адмовіцца — не тыя, маўляў, часы. Але згадзіўся — надта ўжо хацелася атрымаць кампетэнтныя адказы хоць на некалькі пытанняў. Падстаў для сумненняў у кампетэнтнасці В. Байдака быць не можа: мала хто ведае гандлёвыя праблемы так, як чалавек, які зрабіў кар'еру ў сталінным гандлі, дайшоўшы там да самага верху.

Прапануючы ўвазе чытачоў яго пісьмовы адказ на некалькі (мажліва, не вельмі ўдала выбраных з вялікай колькасці) пытанняў, пакідаю за сабой права на невялікія заўвагі, якія абавязкова выказаў бы ў працэсе жывой гутаркі, каб меў такую магчымасць.

— Цэнаўтварэнне. З чаго сёння складаюцца цэны і якая іх частка ідзе на ўтрыманне гандлю?

— Важнасць гэтага пытання відавочная. Цэны ж на тавары і прадукты — сёння найвастрэйшае сацыяльнае пытанне, якое хвалюе літаральна кожнага, бо ўсе мы, у канчатковым выніку, пакупнікі. І тут хацелася б асабліва падкрэсліць наступнае. Сродкі масавай інфармацыі, па-папулісцку падладжваючыся пад настрой асобных катэгорый працоўных, настойліва ўдзёўбваюць (іншага слова не падбяру) сваім чытачам, гледачам, слухачам думку аб тым, што непамерна высокія цэны на сённяшнім нашым рынку — справа рук работнікаў гандлю. З усёй адказнасцю заяўляю: гэта зусім не адпавядае сапраўднасці. Цэны сёння фарміруе вытворца тавараў, закладваючы ў іх усе свае расходы, падаткі і добры прыбытак без якіх бы там ні было абмежаванняў. Гандаль жа пастаўлены ў жорсткія рамкі ўстаноўленых зверху гандлёвых скідак і націнак, 80 працэнтаў з якіх ідзе на пакрыццё непамерна ўзросшых расходаў на транспарт, арэнду, падаткі, крэдыты і г. д.

Прывяду толькі адзін прыклад: дастаўка і продаж адной тоны хлеба прыносіць нам 99 рублёў страт, адной тоны малака — 120 рублёў. Можа хтосьці думае, што ў сферы гандлю высокая зарплата. Мяркуйце самі: сярэдняя зарплата за апошнія два месяцы склала 982 рублі, або на 331 рубель менш, чым па народнай гаспадарцы рэспублікі.

Не інакш, як трэба чакаць у хуткім часе масавага адтоку працаўнікоў з-за прылаўкаў да заводскіх канвееравў, дзе зарплата значна большая. Калі справа толькі ў зарплаце.

Што да гандлёвых скідак і націнак, дык падчас праверак неаднаразова высвятляліся факты іх перавышэння з вяртаннем «лішніх» грошай. Куды? Вядома, не пакупнікам — у казну. А тое, што гандаль церпіць страты на хлебе і малаку, мы адразу адчулі — ні таго, ні другога ўжо без праблем не купіць.

— Адкуль бяруцца цэны на імпарт? Назавіце, калі можна, прозвішча ініцыятара і канкрэтнага выканаўцы закупкі за мяжой партыі «рыдлёвак для кемпінга», якія зараз рэалізуюцца ў дзяржгандлі па 1.405 руб. 08 кап. за штуку.

— Устанаўліваць цэны на імпартныя тавары, рэалізуемыя ў гандлёвай сетцы рэспублікі, дадзена права прадпрыемствам і арганізацыям, якія купляюць тавары ў замежных пастаўшчыкоў. Натуральна, што цэны ўстанаўліваюцца зыходзячы з кан'юнктуры рынку і якасці набываемых тавараў. Улічваецца таксама іх так званы імпартны кошт, пералічаны на рублі па ўстаноўленаму курсу, а таксама расходы па закупцы і дастаўцы тавараў да граніцы.

Што датычыць другой часткі вашага пытання, то вы не зусім дакладна інфармаваны. Вырабы, аб якіх ідзе гаворка, называюцца не «рыдлёўка для кемпінга», а «рыбалоўна-турысцкі набор» вытворчасці Тайваня, які складаецца з 11 прадметаў розднага прызначэння: пілы-рыдлёўкі, гаечныя ключы (тры штукі), прыстасаванне для забівання калкоў для палатак, лёска рыбалоўная, ручкі рыбалоўныя, нож, компас, прыстасаванне для мацавання да пояса. Увесь набор сапраўды каштуе 1.405 руб. 08 капеек. Але справа ў тым, што ён не закуплены, а ў колькасці ўсяго 3 адзінак для вывучэння попыту быў прыняты на камісійных пачатках (г. зн. з аплатай пасля рэалізацыі) у малога прадпрыемства «Консумер» (г. Мінск) магазінам «1.000 дробязей» і праз некалькі тыдняў вернуты пастаўшчыку як тавар, які не карыстаецца попытам.

Не зусім дакладна «праінфармаваў» мяне цэннік, на якім было напісана менавіта «рыдлёўка для кемпінга». Дарэчы, бачыў я гэтыя наборы ў колькасці яўна большай за 3 адзінкі, і не толькі ў «1.000 дробязей», але і ў магазіне «Крышталь». Так што не зусім дакладна інфармаваны не я адзін.

Але не ў рыдлёўцы справа. У шокавы стан здольныя прывесці бюстгальтары па 300 з нечым, белыя бавоўняныя майкі па 400. Калі цэны ў дзяржгандлі фарміруюцца зыходзячы са спекуляцыйнага курса долара, ці не лагічна гэткім жа чынам разлічваць і пражытачны мінімум? Колькі атрымаем — тры, чатыры «зялёныя» ў месяц? І чым скончацца такія «гульні» са сваім народам?

— Ці праўда, што магазіны яшчэ атрымліваюць з баз тавары па цэнах мінулага года?

— Не. Гэта не адпавядае рэчаіснасці. На самай справе: якому пастаўшчыку (у даным выпадку вы гаворыце аб базах) выгадна адпускаць тавары па цэнах мінулага года і цярпець страты? З моманту пераацэнкі тавараў у сувязі з лібералізацыяй цэн (3 студзеня гэтага года) магазіны атрымліваюць іх з баз па свабодных, дагаворных цэнах, і ніякая «самадзейнасць» тут недапушчальная. Калі вы маеце інфармацыю іншага плана, прадастаўце яе ў распараджэнне Мінгандлю для прыняцця тэрміновых і неадкладных мер.

Усё гэта вельмі слушна. Але толькі ў тым выпадку, калі сярод «прадпрымальнікаў», што «здымаюць пенкі» з розніцы паміж цаной колішняй і сённяшняй праз таўкучкі на Камароўцы і «Дынамаў», рэкламныя аб'явы, камерцыйныя кіёскі, польскія важкі і г. д., няма работнікаў гандлю ці іх сваякоў.

— Як уплывае на насычанасць рынку продаж тавараў па купонах? Хто вырашае, па купонах ці не павінен прадавацца той або іншы тавар? Ці не зніжае наогул гэты разнабой эфект ад увядзення купоннай сістэмы?

— Продаж тавараў па купонах — гэта, перш за ўсё, адна з мер урада Беларусі па абароне спажывецкага рынку. Ці паўплывала гэта на насычанасць таго ж рынку таварамі? На жаль, толькі ў некаторай ступені, бо ўдалося скараціць вываз за межы рэспублікі вострадэфіцытных харчовых і прамысловых тавараў і часткова было прадастаўлена спецыяльна створанай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Але выканкомы, замест уняцення прапаноў у Савет Міністраў, сталі самастойна прымаць рашэнні, пашыраючы пералік тавараў, рэалізуемых без купонаў. Вялікая колькасць такіх змяненняў, іх разнабой па рэгіёнах не дазваляюць устанавіць які-небудзь кантроль за правільнасцю забірання купонаў і паўнатой іх здачы магазінамі. Цяпер гэты працэс ужо незваротны.

Ясна адно: якая б сістэма ні прымянялася (а цяпер усё больш верагоднасці, што будуць прымяняцца шматразовыя купоны), галоўнае — мець магчымасць устанавіць дакладны парадак уліку. Калі гэтага не будзе, шматразовыя купоны чакае такі ж лёс. А гэта ж, паўтараю, вельмі дарагое мерапрыемства.

— Апошнім часам распаўсюджанай стала з'ява, калі адміністрацыя магазінаў трымае ў падсобках і іншых памяшканнях асабістыя рэчы, у тым ліку і ф. вялікай колькасці. Ці лічыцца гэта за парушэнне і як павінна карацца?

— Перш за ўсё я не стаў бы абагульняць, бо з'ява, аб якой вы гаворыце, паводле інфармацыі, якая ў мяне ёсць, не мае шырокага распаўсюджання ў гандлёвай сетцы рэспублікі. А цяпер па сутнасці. Захоўванне работнікамі магазінаў асабістых рэчаў на рабочым месцы заканадаўчымі актамі не забаронена.

Аднак у мэтах захавання санітарных норм «Асноўнымі правіламі работы магазіна» прадугледжана, што асабістыя рэчы павінны захоўвацца ў асобным памяшканні ў прызначаных для гэтых мэт шафах.

Работнікі магазінаў, у тым ліку і адміністрацыя, у сваёй рабоце абавязаны кіравацца ўказанымі «Правіламі», добра ведаць іх і забяспечваць няўхільнае выкананне.

За невыкананне правілаў гандлю яны прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці або абкладаюцца штрафам органамі Дзяржгандальінспекцыі і санітарнага нагляду.

Не зусім згодны наконт маштабаў з'явы. Калі я ўдзельнічаў у рэйдах рабочага кантролю па мінскіх магазінах, то толькі ў адным а некалькіх праверанных не знайшлося асабістых рэчаў адміністрацыі — відаць, з-за маленькіх памераў гэтага магазіна. Затое ў астатніх... Пра «скарбы» былога дырэктара магазіна № 12 Фрунзенскага райхарчгандлю можна было прачытаць у «Звяздзе» за 7 лютага. А, напрыклад, пра магазін № 2 Ленінскага райхарчгандлю нідзе не згадвалася. Між тым, таксама цікава. У той час, як соль-макароны і іншае складзіравалася там абы-як, дырэктар Жолудзева Р. М. у асобных памяшканнях, з належным клопатам захоўвала кухонны гарнітур, разабраны ложак, веласіпед і — уявіце сабе — нават новы матацыкл «Мінск». Больш таго, побач з матацыклам стаяў 40-літровы бітон з-пад малака ці смятаны, паўнюткі бензіну. А процьма акуркаў ад цыгарэт з фільтрам са слядамі губной памады, раскіданых вакол бітона, сведчыла пра тое, што менавіта сюды прыбягалі на «перакур» маладзенькія прадаўшчыцы.

Не сакрэт, што ў чаканні павышэння цэн людзі імкнуліся ўкласці грошы ў нейкія тавары, каб потым, прадаўшы іх па новай цане, неяк выратаваць свае зберажэнні ад інфляцыі. Лепей за ўсіх атрымалася гэта ў тых, хто меў доступ да тавараў, — у работнікаў гандлю. Многія набралі столькі, што толькі на складах і трымаць.

Хоць, зрэшты, можна не абагульняць.

— Якія перспектывы прыватызацыі гандлёвых прадпрыемстваў? Ці павінна ёй папярэднічаць прыватызацыя аптовага гандлю?

— У Мінску і рэспубліцы на працягу гэтага года мяркуецца прыватызаваць каля 500 прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Найбольш буйныя прадпрыемствы намячаецца пераўтварыць у акцыянерныя таварыствы, дробныя — прадаць працуючым там калектывам або прыватным асобам.

Што датычыць прадпрыемстваў аптовага гандлю, то 8 мінскіх аптовых баз і холадакамбінат у 1991 годзе здадзены Мінсандлю ў арэнду. Але ня той прычыне, што аптовыя прадпрыемствы, спецыялізаваныя на канкрэтных групах тавараў, займаюць вядучае становішча на абласных спажывецкіх рынках і да таго ж (што немаловажна) ажыццяўляюць захоўванне дзяржаўных рэзерваў, іх прыватызацыя, на нашу думку, пакуль немэтазгодная.

Разам з тым мы сумесна з выканкомамі маем намер праводзіць работу, як гэта і прадугледжана нядаўна прынятым рашэннем урада, па стварэнню паралельных канкурыруючых пасрэдніцкіх структур, заснаваных на розных формах уласнасці.

Калі я добра зразумеў, прыватны аптовы гандаль прыйдзецца ствараць на пустым месцы. Калі-небудзь. І наогул, хуткая прыватызацыя гандлю не пагражае, бо 500 прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання — гэта лічба не для рэспублікі і нават не для буйнога горада. Столькі налічваецца прыкладна ў двух раёнах.

— Хто, на вашу думку, будзе прадстаўляць прыватны сектар у гандлі?

— Прыватызавацца будуць, у першую чаргу, дробныя магазіны, ларкі, палаткі і прадпрыемствы грамадскага харчавання агульнадаступнай сеткі, а таксама стратныя і маларэнтабельныя гандлёвыя кропкі.

Прабачце, я спытаў, не што будзе прыватызавана, а хто гэта зробіць. Памылка ў адказе хутчэй за ўсё гаворыць аб тым, што такога пытання не існуе наогул: тыя самыя «выдатнікі савецкага гандлю», што абслугоўвалі нас усё жыццё. Сумна.

— Што трэба зрабіць, каб гандаль — самая мабільная сфера эканомікі — нарэшце займеў цывілізаванае аблічча, г. зн. павярнуўся тварам да пакупніка?

— Так ужо склалася ў нашай рэальнасці: гандаль, вобразна кажучы, стаіць на каленях перад вытворцам, пакупнік — перад гандлем, працоўны чалавек — перад чыноўнікам і г. д. А трэба б наадварот. І гандаль не набудзе цывілізаванага аблічча да таго часу, пакуль усё, што з ім звязана — прамысловасць, транспарт, іншыя галіны, якія яго абслугоўваюць, нарэшце, мы самі, — не стане цывілізаваным. Як ні дзіўна гэта гучыць, але гандаль — люстэрка эканомікі, і таму ён рэальна адлюстроўвае тую бязрадасную і шэрую рэчаіснасць, якая вакол нас. Спадзявацца на тое, што адзін толькі гандаль зможа стаць лепшым, у той час як усё астатняе застанецца без змяненняў, прынамсі, наіўна. Гавару гэта з вялікім жалем, але і з надзеяй, што будзе калі-небудзь свята і на нашай «гандлёвай» вуліцы.

З'явяцца тавары і прадукты, назаўжды знікнуць так усім абрыдлыя словы — «дэфіцыт», «чарга», «купоны», «талоны»...

Але для таго, каб наблізіць гэты светлы і радасны час, нам — па той бок прылаўка, вам — па гэты, паважаныя чытачы, прыйдзецца яшчэ шмат і добра папрацаваць. Іншага шляху няма.

Я задаў наіўнае пытанне, але мне яго падказала жыццё. Неяк убачыў, як у агародніным кіёску маладая прывабная прадаўшчыца ўпарта намагалася падсунуць відавочнае гнілё пажылой кабеце. Тая працівілася, спрабавала выбіраць. Прадаўшчыца не дазваляла. Нарэшце стомленая барацьбой кабета опытала, не спадзеючыся на адказ: «Ну калі ж гэта гандаль будзе для пакупніка?»

Але прадаўшчыца адказала. З неймавернай грымасай злосці на маладым прыгожым твары яна гучна, амаль па літарах вымавіла: «Ні-ко-лі!»

Аляксандр БЯРСУДСКІ.

СУБ'ЕКТЫЎ

2. Рэзервацыя

«Я Б САБЕ ТАКОГА ТАТЫ НЕ ЖАДАЎ...»

«Кватэрнае пытанне іх загубіць», — казаў месір Валанд. Дазволю сабе дадаць — і транспартнае таксама. Вядома, гэта што датычыць майго ўжо роднага «Паўднёвага Захаду», за ўсю сталіцу казаць не магу.

Заехаць сюды і выехаць адсюль, безумоўна, можна. Усё пытанне ў тым — як і калі. Ну, вось давайце выедзем. Зробім гэта ранкам, гадзін так у 7—8.

Едзем 81-м маршрутам аўтобуса. Самы, трэба сказаць, папулярны маршрут. І, да нядаўняга часу, адзіны. Народ з праспекта Любімава, вуліц Бялецкага, Рафіева, праспектаў газеты «Известия» і газеты «Правда» дабіраецца да сваіх заводаў і офісаў менавіта на ім. Есць яшчэ некалькі тралейбусных і аўтобусных маршрутаў, але, скажам, да чыгункі даехаць можна толькі 81-м. Апошнім часам прыбавіўся 1-ы, аднак ходзіць ён неяк няўпэўнена — відаць, залежыць ад «настрою» рухавіка.

Каракцей кажучы, ранкам і вечарам у 81-ы не ўбіцца. 20—25 мінут да вуліцы Маскоўскай едзеш, як салдат на страявым агляндзе — па стойцы смірна. Добра, калі побач маладая жанчына — часу і нязручнасцей не заўважаеш; горш, калі граміла шырынёй метра паўтара і з пахмелля.

Ранкам яшчэ сюды-туды, усё ж пасля глыбокага здаровага сну. Вечарам жа галава гудзе і патрэсквае, і, калі табе ўставяць у бок жалезны востры локаць, хочацца (даруй мне, Божа!) самае меншае—выляйца. А самае большае—эмігрыраваць у нейкую там Швецыю (калі дазволяць) і перш-наперш купіць сабе хоць які-небудзь іржавы рыдван за 100 крон, на які шведскія сабакі нават грэбуюць задраць нагу. Прашу, канешне, прабачыць за такія непатрыятычныя думкі.

А наогул, калі кожны дзень траціш на язду (ды якую!) гадзіну-паўтары, то і не такія думкі прыйдуць у галаву. Да таго ж, сын незадаволены: тата прыйшоў і як куль зваліўся на канапу, не хоча гуляць з сынам, а толькі ляжыць і войкае. Я б сабе такога таты не жадаў.

Не кажу ўжо пра жонку...

Урэшце, калі так захацелася паехаць, то можна і на маршрутным таксі № 3. Як гаворыцца, хутка, зручна і тан... пардон, танна было, цяпер — 4 рублі. Для таксі, каракцей кажучы, патрэбна больш тоўстая кішэнь. І на тых, хто яе мае, прыпынак паглядае, ну, скажам, без асаблівай прыязнасці. Яно так: штодзень 8 рублёў, у месяц (без выхадных) — 180—190 рублёў, амаль кілаграм вэнджанай каўбасы «сервелат». Трэба выбіраць.

Далейшыя транспартныя перспектывы мікрараёна ўяўляюцца цьмянымі і таямнічымі. Што б нам ні абяцалі высокія кіраўнікі, а бензін адным прыгожым ранкам падаражае. Ён падаражае, а зарплата аўтобуснікаў, канешне, большай не стане. І яны, вядома, забастуюць. І ім, безумоўна, зарплату павысяць, а разам з ёю — кошт праезду. Так што народ не дарэмна гаворыць пра 4-рублёвыя талончыкі. Дыму без агню не бывае, а аўтамабіля — без бензіну.

Метро? Магчыма, яно так і застанецца пункцірам на карцесхеме Мінскага метрапалітэна. Памятаеце? Станцыя «Інстытут культуры», а далей — беленькі такі пункцірчык. Наўрад ці на ім да «Паўднёвага Захаду» даедзеш. Ды і дарагая гэта цацка — метро. Асабліва для перадрыначнай краіны, дзе грошай заўсёды і ўсюды хапае толькі на зарплату чыноўнікам.

ДЗЕЦІ — КВЕТКІ ЖЫЦЦЯ

Ні ў якім разе я не збіраюся аспрэчваць гэты бессмяротны выраз, калі хто западозрыў тут іронію. Што вы, нават наадварот. З дарагой душой, як гаворыцца. Таму і вырашыў удзяліць колькі радкоў становішчу маладой генерацыі ў нашым мікрараёне.

Дзеці, як вядома, ходзяць у школы. А школ мала. Як, дарэчы, і магазінаў (праўда, тут іншыя крытэрыі). У магазін можна і не пайсці, у школу ж хадзіць трэба абавязкова.

У большасці школ — нармальная з'ява, калі ёсць 3-ці «Г», 3-ці «Е», магчыма з'яўленне 3-га «Ё». Нармальная з'ява — 35—37 чалавек у класе, і бацькам трэба маліць Бога, каб настаўніца дзіцяці аказалася вопытнай і цярплівай. Наогул, большасць тат і мам хвалюе зараз не тое, як дзіця вучыцца, а тое, што яно ў школе есць і што пасля школы робіць.

Ну, што робіць? Гойсае па наваколлі разам з такімі ж. У наваколлі апрача дамоў, нацяперашнім часе крыху дарагаватая. Плюс да таго ў многіх школах яна проста скарачаецца — няма дзе вучыць 3-ці «Е» ці 4-ты «Д». Застаецца двор. Са сваімі правіламі гульні, сваімі законамі. Не буду падкрэсліваць, што ад агульнапрынятых яны некалькі адрозніваюцца.

Не адна матуля, седзячы на рабоце, уздрыгвае: дзе мой Васечка, што робіць, ці хоць знайшоў што паесці. У тат нервы больш моцныя па іх мужчынскай прыродзе, але сумняваюся, што яны вельмі ўдзячныя савецкай дзяржаве за «шчаслівае дзяцінства» сваіх Васечак і Пецечак.

Васечка ж можа: 1) пайсці на «відзік», 2) купіць «жвачкі», 3) пакатацца на грамадскім транспарце, 4) паглядзець тэлевізар, 5) пакурыць ці прыкласціся да бутэлькі (калі растуць ужо вусы), 6) нарэшце, усё можа зрабіць Васечка, калі рабіць няма чаго, а бацькі зарабляюць рыначную зарплату.

У прынцыпе, калі ёсць здольнасці, можна трапіць у цэнтр эстэтычнага выхавання або гурток пры �жЭСе ці школе. Але лёў, лясоў ёсць будоўлі. Усе мы былі дзецьмі і памятаем, што гэтае месца прыцягвае лепш за магніт. Апрача выдатнага палігона для «вайнушкі» і многіх іншых захапляючых гульняў, тут можна элементарна скруціць шыю. Што, я ўпэўнены, не спадабаецца ніводнаму бацьку.

А група падоўжанага дня, канешне, справа добрая, але па гэта — калі яны ёсць. У процілеглым выпадку можна запісацца ў секцыю ўсходніх адзінаборстваў, на якія якраз бум. Тут, праўда, трэба плаціць грошы. Наогул, усюды зараз патрэбны грошы, усе раптам успомнілі пра гасразлік. І бацькі не раз і не два падумаюць: ці ёсць у іх лішнія сродкі, калі кватэра новая і голая, калі патрэбна «кухня» і хоць нейкая канапа, калі звычайны замок ужо дайшоў да 256 рублёў за штуку, ды, нарэшце, апрача Васечкі ёсць яшчэ Толечка і Волечка, а на падыходзе (не дашанцавала!) чацвёрты. Няхай сабе носіцца па двары, і мы не лепш жылі.

Ну, а калі вы аднойчы з жахам даведаецеся, што ваш Васечка зацікавіў людзей з К. Лібкнехта, 49 (Маскоўскі РАУС), то што ж, такі, відаць, лёс. І калі вы зусім выпадкова сустрэнеце падросшага Васечку ў піўной чарзе ля «чырвонага» універсама, таксама пастаўцеся да гэтага па-філасофску. Урбанізацыя. Праблемы вялікага горада і маленькага чалавека. Які, чым большы горад, тым меншы.

Я, зразумела, не ставіў сабе задачы выдаць энцыклапедыю мікрараёна, напісаць усё, што можна пра яго напісаць. Я нават не ведаю, колькі на «Паўднёвым Захадзе» насельніцтва. І не хачу ведаць. Мне больш цікава, як гэтае насельніцтва жыве.

А дрэнна. У першай частцы нататкаў прамільгнула слоўца «рэзервацыя» ў дачыненні да навакольных вёсак. Тут памылка. Рэзервацыя — гэта мы, мікрараён. У цэнтры такіх не селяць. Можа, хіба што ў інтэрнатах. Нос не дарос. Наменклатура ў нас не жыве. Для яе — Пуліхава, Вайсковы, Бранявы. Для яе — цікія і багатыя гастраномы, машына ля пад'езда, «хата» на 100 «квадратаў» і дача на тры наверхі ў Бараўлянах. Цікавыя даныя прывёў адзін дэпутат. Работнік гаража Саўміна (сям'я 2 чалавекі, жылая плошча — 47 кв. м.), без усялякай чаргі атрымлівае ўчастак для будаўніцтва жылля ў Бараўлянах. Малады спецыяліст — таксама. Аднак першы будзе будаваць дачу, для чаго з Баранавіч прывёз 67 тысяч цаглін усяго за сотню рублёў (паспрабуйце), 6 унітазаў (відаць, добра харчуецца) і шмат чаго/іншага, і па дзяржцане, і без чаргі.

Я разумею: Бог дзеліць няроўна, так было і так будзе. І разумею, калі лепш за мяне жыве акадэмік ці выдатны дзяржаўны дзеяч, тут у мяне сапраўды нос не дарос. Відаць, таленту, розуму ў іх больш. Так і трэба. Зусім жа не магу зразумець, калі мне кажуць: вось, думаем аб людзях, будуем жыллё, можна сказаць, усёй душой хварэем за іх, і маршрут новы адкрыем і універсам дабудуем, — усе наказы выканаем, для таго пастаўлены.

А я, грэшны чалавек, думаю, што пастаўлены яны зусім для іншага. Ага, слесар — на «Паўднёвы Захад», а калі вадзіцель міністра — на Нямігу яго, і гэтак далей. Ну, хто аспрэчыць, што нават сярэдні начальнік не будзе жыць са мной на адной лесвічнай пляцоўцы? А калі яго там дакладна не будзе, то можна і прасцей, без фокусаў. Хопіць з іх аднаго маршрута і аднаго універсама на 25 тысяч. Не ў палацах выхоўваліся.

Хлусня гэта, што рынак усіх зраўняе. Нас, магчыма, зраўняе, нават дакладна зраўняе. Іх — не.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» з моманту яго апублікавання.

2. Устанавіць, што да прыняцця заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» дзеючыя акты заканадаўства прымяняюцца, паколькі не супярэчаць названаму Закону.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 жніўня 1992 года прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы па ўнясенню змяненняў і дапаўнення ў заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

27 сакавіка 1992 г.
г. Мінск

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб грашова-крэдытнай палітыцы Рэспублікі Беларусь на 1992 год

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Прыняць да ведама Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 1992 год (прыкладаюцца).

2. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь:

у двухмесячны тэрмін прапрацаваць варыянты магчымых практычных дзеянняў (аж да ўвядзення нацыянальнай грашовай адзінкі) па прадухіленню негатыўных вынікаў у выпадку ўвядзення ўласных нацыянальных валют у рэспубліках былога СССР;

распрацаваць механізм узаемных разлікаў з іншымі дзяржавамі на дагаворнай клірынгавай аснове.

3. Планавай і бюджэтна-фінансавай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь абагульніць прапановы, выказаныя народнымі дэпутатамі Рэспублікі Беларусь пры абмеркаванні дадзенага пытання, і ўлічыць іх пры падрыхтоўцы адпаведных законапраектаў і ў працэсе рэалізацыі Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

28 сакавіка 1992 г.
г. Мінск.

ДАДАТАК ДА ПАСТАНОВЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 28 САКАВІКА 1992 ГОДА

АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 1992 ГОД

1. У 1991 годзе становішча ў эканоміцы рэспублікі і яе грашова-крэдытнай сферы пагоршылася. У сувязі са скарачэннем аб'ёмаў вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі валавы нацыянальны прадукт да ўзроўню 1990 года склаў усяго 98 працэнтаў, нацыянальны даход — 97 працэнтаў, у той жа час сукупная грашовая маса ў абарачэнні ўзрасла за мінулы год у 1,7 раза.

Такое значнае павелічэнне грашовай масы выклікана ростам грашовых даходаў насельніцтва і встаткаў сродкаў на рахунках прадпрыемстваў і арганізацый, якія ўзраслі за 1991 год адпаведна ў 2 і 1,9 раза. Гэтаму сведчыць эканамічна неабгрунтаваная крэдытная палітыка. Агульная пазыковая запазычанасць за год узрасла ў цэлым па рэспубліцы на 20,9 млрд. рублёў, у тым ліку крэдыты прадпрыемствам і насельніцтву — на 12,8 млрд. рублёў, або ў 2,2 раза, па пакрыццё бюджэтных расходаў — на 8,2 млрд. рублёў, або ў 1,4 раза.

Па стану на 1 студзеня 1992 года доля крэдытных укладанняў на пакрыццё дзяржаўнага ўнутранага доўгу былога Саюза ССР і Рэспублікі Беларусь, а таксама іншых бюджэтных расходаў у агульнай суме крэдытаў склала 56 працэнтаў.

Крайне нездавальняючай з'яўляецца структура дэпазітных сродкаў, у агульнай масе свабодных грашовых сродкаў прадпрыемстваў дэпазіты да запатрабавання складаюць звыш 90 працэнтаў.

Апераджальны рост грашовай масы адносна рэальных эканамічных паказчыкаў узмацніў інфляцыйныя працэсы. Рубель практычна перастаў выконваць функцыю пасрэдніка паміж таваравытворцамі, курс яго ў адносінах да іншых валют рэзка ўпаў.

Выходзячы з аналізу крэдытна-разліковых адносін з народнай гаспадаркай галоўнымі задачамі грашова-крэдытнай палітыкі рэспублікі ў 1992 годзе з'яўляюцца:

аднаўленне пакупной здольнасці грошай і ўзяцце пад кантроль інфляцыйных працэсаў;

садзейнічанне пераадоленню тэндэнцый агульнага пагаршэння эканамічнага становішча рэспублікі пры дапамозе крэдыту;

абарона інтарэсаў укладчыкаў, умацаванне плацежаздольнасці банкаў і павышэнне ліквіднасці іх балансаў.

Вырашэнне гэтых задач прадугледжвае рэзкае абмежаванне тэмпаў росту крэдытных укладанняў у народную гаспадарку і паляпшэнне структуры размяшчэння свабодных грашовых сродкаў, скарачэнне ўдзельнай вагі дэпазітаў да запатрабавання, якія прадстаўляюць бягучую грашовую масу, і значнае адцягненне іх у інвестыцыі ў форме тэрміновых укладаў і каштоўных папер.

2. У мэтах выканання задач грашова-крэдытнай палітыкі ў бягучым годзе:

2.1. Зацвердзіць на 1992 год нарматывы абавязковых рэзерваў, якія размяшчаюцца ўсімі камерцыйнымі банкамі ў Нацыянальным банку: па сродках і дэпазітах да запатрабавання — 20 працэнтаў, дэпазітах і ўкладах, прыцягнутых на тэрмін ад 1 месяца да 1 года, — 15 працэнтаў, ад 1 года да 3 гадоў — 10 працэнтаў, а звыш 3 гадоў рэзервовыя патрабаванні не ўстанаўліваюцца. Вылічаныя па ўказаных нарматывах абавязковыя рэзервы змяншаюцца на суму сродкаў, укладзеных банкамі ў каштоўныя паперы, якія выпускае ўрад.

2.2. Устанавіць уліковую стаўку па крэдытах Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у размеры 20 працэнтаў, рэгулюючы яе ўзровень з улікам інфляцыйных працэсаў у адносінах да студзеня 1992 года.

Па крэдытных аперацыях камерцыйных банкаў устанавіць маржу ў сярэднім у межах да 7 пунктаў. У выпадку яе перавышэння розніца падлягае пералічэнню ў даход бюджэту.

3. Банкам Рэспублікі Беларусь:

3.1. Забяспечыць рацыянальнае размяшчэнне крэдытных рэсурсаў, накіроўваючы іх у першую чаргу на вырашэнне задач, звязаных з паскарэннем навукова-тэхнічнага прагрэсу, правядзеннем мерапрыемстваў па павышэнню эфектыўнасці вытворчасці, стымуляваннем выпуску тавараў народнага спажывання і экспартных паставак, развіццём сацыяльнай сферы, жыллёвага будаўніцтва і платных паслуг насельніцтву, ажыццяўленнем працэсаў раздзяржаўлення і прыватызацыі.

3.2. Кароткатэрміновыя крэдыты народнай гаспадарцы прадастаўляць толькі на пакрыццё часовай патрэбнасці ў грашовых сродках, не дапускаючы павелічэння ўкладанняў пазыковага капіталу ў закрэдытаваныя гаспадаркі, не выкарыстоўваючы крэдыты на пакрыццё страт і рызыкоўных мерапрыемстваў, якія прыводзяць да страты прадпрыемствамі і іншымі ўкладчыкамі змешчаных у банкі сродкаў. Выдачу доўгатэрміновых крэдытаў праводзіць на ажыццяўленне высокаэфектыўных мерапрыемстваў з хуткімі тэрмінамі акупнасці (да 5 гадоў).

Рэкамендаваць гаспадарчым органам пры недахопе ў іх абаротнага капіталу атрымліваць неабходныя грашовыя рэсурсы на фінансавым рынку шляхам аб'яднання рэсурсаў на паявой аснове, выпуску акцый і размяшчэння пазыковых абавязацельстваў.

3.3. Пачынаючы з 1992 года расходы па выплаце розніцы ў цэнах на сельскагаспадарчую прадукцыю ажыццяўляць непасрэдна з бюджэтных рахункаў у межах сродкаў, якія ёсць на іх, выключыўшы выкарыстанне крэдытаў банкаў на гэту мэту.

3.4. Прадастаўляць крэдыты на выкуп дзяржаўнай маёмасці толькі шляхам пераафармлення існуючай запазычанасці бюджэту ў абавязацельствы юрыдычных асоб і грамадзян з накіраваннем пазыкі на пагашэнне ўнутранага дзяржаўнага доўгу.

3.5. Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь забяспечыць пры неабходнасці абмежаванне продажу крэдытных рэсурсаў за межы рэспублікі з улікам стану плацежнага балансу з дзяржавамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

3.6. Пры крэдытаванні індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва і жыллёва-будаўнічай кааперацыі пад ільготны працэнт пакрыццё страт банкаў ажыццяўляць за кошт сродкаў адпаведных бюджэтаў ці прадпрыемстваў і арганізацый, дзе непасрэдна працуе пазычальнік.

4. Устанавіць для камерцыйных банкаў наступныя велічыні эканамічных нарматываў, накіраваных на падтрыманне іх ліквіднасці:

мінімальны размер статутнага фонду — 60 млн. рублёў;

гранічныя суадносіны паміж размерам уласных сродкаў банка і сумай яго актываў — не менш 0,06 (у першым паўгоддзі — не менш 0,03);

максімальны размер рызыкі на аднаго пазычальніка не павінен перавышаць 0,5 уласных сродкаў банка. Агульная сума ўсіх буйных крэдытаў не можа перавышаць васьмікратны размер уласных сродкаў;

каефіцыент кароткатэрміновай ліквіднасці балансу — не ніжэй 0,8;

каэфіцыент сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай ліквіднасці балансу — не вышэй адзінкі.

5. Ашчаднаму банку Рэспублікі Беларусь:

5.1. Забяспечыць перадачу Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь на дагаворнай аснове крэдытных рэсурсаў у размеры 70 працэнтаў ад прыросту ўкладаў насельніцтва з правам удакладнення гэтага нарматыву ў залежнасці ад змянення патрэбнасці ў рэсурсах для крэдытавання насельніцтва, арганізацыі вытворчасці тавараў народнага спажывання і развіцця паслуг.

5.2. Па ўзгадненню з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь перыядычна пераглядаць працэнтныя стаўкі па ўкладах грамадзян, змешчаных на тэрмін, з улікам кан'юнктуры таварна-грашовага рынку.

6. Аперацыі па карэспандэнцкіх рахунках камерцыйных банкаў і іх філіялаў ажыццяўляюцца ў межах наяўнасці сродкаў на гэтых рахунках.

7. Рэкамендаваць камерцыйным банкам Рэспублікі Беларусь з мэтай зніжэння рызыкі іх фінансавых аперацый і ў выпадку недастатковасці ўласных сродкаў для выдачы буйнога размеру крэдыту аднаму пазычальніку выкарыстоўваць прынцып кансарцыяльнага крэдытавання з прыцягненнем сродкаў некалькіх банкаў і на ўмовах салідарнай адказнасці.

8. У мэтах скарачэння ўзаемнай запазычанасці гаспадарчых органаў і наяўна-грашовага абароту ўвесці ў народнай гаспадарцы рэспублікі разлікі паміж пастаўшчыкамі і спажыўцамі прадукцыі праз вэксалі з ажыццяўленнем банкамі крэдытных аперацый па іх уліку і перадыскантаванні.

9. Правесці ў рэспубліцы комплекс арганізацыйных мер па змяненню сістэмы інвестыцый у народную гаспадарку. Устанавіць парадак, пры якім у выпадку недастатковасці ў інвестараў сродкаў апошнія акумулюючуца шляхам выпуску імі каштоўных папер (аблігацый, акцый, казначэйскіх абавязацельстваў і інш.), што распаўсюджваюцца праз банкі, брокерскія канторы, фондавыя біржы і непасрэдна юрыдычнымі асобамі.

10. У галіне валютнай палітыкі:

10.1. У мэтах акумуляцыі валюты ўпаўнаважаных банкаў Рэспублікі Беларусь валютных сродкаў для абслугоўвання знешняй пазыкі, аплаты тавараў і паслуг, якія імпартуюцца, стварэння Дзяржаўнага валютнага фонду Рэспублікі Беларусь, валютных фондаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь і выкарыстання на іншыя мэты ўстанавіць, што юрыдычныя асобы прадаюць паступіўшую на іх рахункі валютную выручку па спецыяльнаму курсу, які вызначаецца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з яго рэальнай пакупной здольнасцю і забяспечвае экспарцёрам неабходны ўзровень рэнтабельнасці.

Купля і продаж замежнай валюты камерцыйнымі банкамі, іншымі юрыдычнымі асобамі і грамадзянамі ажыццяўляецца на аўкцыёнах, біржах, міжбанкаўскім рынку па свабоднаму курсу рубля да замежных валют, які складаецца на аснове попыту і прапановы.

10.2. Для забяспечэння своечасовасці і паўнаты паступлення валютных сродкаў па экспартных аперацыях прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў увесці ў рэспубліцы сумесны валютна-мытны кантроль па экспартных здзелках, які прадугледжвае механізм увязкі кантролю руху валютных сродкаў з рухам тавараў.

11. Устаноўленыя Асноўнымі напрамкамі паказчыкі з'яўляюцца арыенцірамі пры ажыццяўленні грашова-крэдытнай палітыкі і могуць карэкціравацца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь з улікам стану грашова-крэдытнага рынку па ўзгадненню з Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

МУЗЫ І БІЗНЕС

ЯК ВЫЖЫЦЬ ТАЛЕНАВІТЫМ МУЗЫЧНЫМ КАЛЕКТЫВАМ У РЫНАЧНАЙ СТЫХІІ? ГРУПА З ДАВОЛІ НЕЧАКАНАЙ НАЗВАЙ «ІНТЭРПОЛ» СВОЙ ШЛЯХ, ЗДАЕЦЦА, АДШУКАЛА

У пачатку яго, як ні дзіўна (а да гэтай з'явы паступова прыйдзецца прывыкаць), бачыцца фігура бізнесмена-прадпрымальніка. Прычым, бізнесмена ўдачлівага, пра якога «Звязда» ўжо, дарэчы, пісала, — віцэ-прэзідэнта, генеральнага дырэктара рэспубліканскай міжгалінавай асацыяцыі «Белаграпрамбудматэрыялы» В. Баграцова.

Не будзем дэталёва аналізаваць даволі-такі надакучыўшую тэму: чаму гэта рытмы рок-кампазіцый адным здаюцца прымітыўнымі, а іншых «заводзяць» — прыводзяць у экстаз. Пагутарым лепш аб дзіўным сімбіёзе нашых дзён — паміж далікатнай духоўнай матэрыяй пад назвай «музыка» і самым матэрыяльным, жалезабетонна-цагляным будаўнічым бізнесам.

Субяседнік карэспандэнта «Звязды» — дырэктар-менеджэр «Інтэрпола» В. ДЗМІТРЭНКА і кіраўнік асацыяцыі «Белаграпрамбудматэрыялы», які пакінуў за сабой права, так сказаць, пазакадравага каментарыя.

Карэспандэнт: Не ў крыўду вам, Віталь, будзе сказана, але ўсё ж: розных рок-груп і груповак сёння — многія дзесяткі, калі не сотні. І кожнай, зразумела, хочацца ўзабрацца на музычны Алімп. У шоу-бізнесе, між тым, называюць такія лічбы: каб «раскруціць» нейкі калектыў, вывесці яго на высокую арбіту сапраўднай папулярнасці і адпаведных заработкаў, патрабуецца 3—4 мільёны «драўляных». На што вы разлічваеце, як думаеце выплаціць у вірлівым жыццёвым моры?

В. Дзмітрэнка: Заўсёды разлічвалі і разлічваем на ўласны розум, прафесіяналізм, а таксама на дапамогу прадбачлівага прадпрымальніка-мецэната — не без гэтага. Аднак бізнес проста так бісер не раскідвае, грошы ў заведама «кіслую» справу не ўкладвае. Патрабуецца адпаведная «візітная картка»...

Наша творчая біяграфія кароткая, але мы паспелі ўжо стаць дыпламантамі фестывалю «На Доўгім Бродзе» (1989 г.) у Мінску, запісаць чатыры магнітаальбомы, з'ездзіць з канцэртамі ў Польшчу, Маскоўскія музычныя крытыкі, спецыялісты шоу-бізнесу ацанілі мастацкі ўзровень групы, нашы кампазіцыі і аранжыроўкі, таму мы і змаглі прабіцца на студыю «Тон-сервіс» да самога Аляксандра Кальянава. За тры тыдні запісалі 39-мінутны альбом. Гэта каштавала, дарэчы, 40 тысяч рублёў. Дзякуй нашаму спонсару В. Баграцову — ён дапамог.

В. Баграцоў (за кадрам): Так, выдаткі па запісу магнітаальбома наша фірма аплаціла, далі мы 20 тысяч рублёў і на арэнду залы для рэпетыцый. Не буду, аднак, упадаць у салодзенькае сюсюканне з нагоды свайго мецэнацтва. У выпадку з «Інтэрполам» «латарэя» ў мяне амаль бяспройгрышная. Да таго ж, маю некаторую музычную адукацыю і бачу, што гэта сур'ёзная рок-група, не нейкая там самадзейнасць. Будучае ў яе ёсць.

Карэспандэнт: Распавядаючы пра свае справы, Віталь, вы расказалі пра Уладзіміра Сяцько, Ігара Сарокіна, Віталя Шкілёнка, Андрэя Езавітава, іншых музыкантаў. Есць сярод іх прафесіянальныя выканаўцы, а ёсць былыя бухгалтары і эканамісты. Смелыя, аднак, хлопцы, калі адважыліся спаліць за сабой масты і падацца, вобразна кажучы, у брэменскія музыканты. Дарэчы, як вы асабіста ўспрымаеце гэту дзіўнаватую назву — «Інтэрпол»? Прабачце, але жарт так і напрошваецца: вы што, збіраецеся змагацца з нейкімі зладзеямі ў шоу-бізнесе?

В. Дзмітрэнка: Жарт прымаю, даю і тлумачэнне. Існавала ў свой час англійская рок-група «Поліс» на чале са Стынгам, якая праіснавала гадоў пяць-шэсць. У сваёй творчасці яна выкарыстоўвала тэксты на тэмы свабоды асобы, пацыфізму, узнімала іншыя важныя грамадскія праблемы. У нас з ёю атрымалася пэўная пераемнасць: музычны строй, творчы напрамак — прыкладна тыя ж, хоць мы ў немалой ступені ўсё гэта развілі далей. Тут і вытокі назвы, якую ўзяла сабе наша рок-група. А наконт барацьбы...

Так, сваёй творчасцю мы якраз і змагаемся з халтурай, камерсантамі-дзялкамі ад музыкі, наогул з агульнай дэградацыяй культуры.

Карэспандэнт: Як я разумею, вы маеце на ўвазе музычны псеўдаавангард, які запаланіў эстраду, усе гэтыя выкрутасы, калі іншы раз іграюць, прабачце, ледзь ці не на ўнітазах?

В. Дзмітрэнка: І гэта — такта. Паказальны ў гэтым плане, з дазволу сказаць, «канцэрт», які адна з мінскіх рок-груп давала ў «Арт-кафэ», у Палацы культуры прафсаюзаў. Здзівіла тое, што людзі іграюць, здавалася б, на звычайных інструментах, але вось метады кампазіцыі, аранжыроўкі — усё накіравана на эпатаж слухача. Не дзіўна, што сапраўдныя аматары сучаснай музыкі, прафесіяналы з канцэрта збеглі, добрага слова ніхто не сказаў. Усім нам трэба адмаўляцца ад падобных глупстваў, як гэта даўно зрабілі на тым жа Захадзе.

Карэспандэнт: Увесь гэты музычны «сатанізм», згодзен з вамі, здорава надакучыў. Аднак выступаць супраць моды, звычайна вельмі агрэсіўнай, няпроста. Калі няма характару, адчування правільнасці выбранага шляху, у бойку лепш не совацца.

В. Дзмітрэнка: Не скажу, што за час сумеснай работы мы траплялі ў шматлікія пераплёты — Бог, як кажуць, бараніў. Аднак выпадкі здараліся... Летась, напрыклад, давалі канцэрт у Палацы культуры і тэхнікі Мінскага аўтазавода. У зале была спецыяльная светлавая ўстаноўка вагой каля паўтоны. Толькі Уладзімір Сяцько паспеў прайсці пад ёю, як яна звалілася — з вышыні ў шэсць метраў.

Пасля гэтага рукі ва ўсіх нас затрэсліся, самі разумееце. Аднак змаглі разславацца — і на саміх сябе, і на наша агульнае гаспадарчае бязладдзе, — далі такі адмысловы канцэрт. Людзі засталіся задаволенымі. Лічу, што ў той сітуацыі сякі-такі характар у калектыва праявіўся.

А вось у адной дзелавой камбінацыі мы паводзілі сябе не лепш, чым тыя пакорлівыя цяляты. Пасля таго як «Інтэрпол» стаў дыпламантам «Доўгага Броду», нас запрасілі ў музычнае турнэ па Польшчы. Арганізаваў яго дзялок з адной з маладзёжных арганізацый Мінска. Як толькі справа дайшла да ганарару за выступленні, дзялок і прапанаваў: навошта, каб такая сума разышлася па кішэнях, лепш купім для рок-групы сучасную апаратуру. Купіў...

Для сваёй арганізацыі, між іншым. Невядома толькі, па якой «чыстай» бухгалтэрыі гэта акцыя была праведзена. Такое вось тыпова «саўковае» вышуканства. І мы з гэтым змірыліся, бо даказаць нічога не можам.

Што ж, бізнес —гэта не жартачкі. Навука, як кажуць, таксама каштуе грошай.

В. Баграцоў (за кадрам): Тут Віталь крыху памыляецца. Які гэта бізнес? Сапраўднае рабаўніцтва, і больш нічога. Наша фірма, што называецца, венікаў не вяжа, робім усё па закону, цывілізавана. З кожным музыкантам я падпісаў узаемны кантракт, дзе абгавораны абавязкі бакоў.

В. Дзмітрэнка: І мы гэта памятаем, як два памножыць на два. 30 працэнтаў прыбытку ад нашай дзейнасці ідзе спонсару, 70 — нам. Яму — каб пагасіць укладзеныя ў калектыў сродкі, нам — на эканамічнае ўмацаванне, фінансавую самастойнасць.

І яе мы даб'ёмся абавязкова. Вось ужо і швейцарскае тэлебачанне зняло пра нас кінасюжэт. Сёння я вяду перагаворы аб заключэнні кантракту з музычнай фірмай з Аўстрыі. Характэрна, што заходнія бізнесмены вельмі хутка «схопліваюць» сітуацыю, бачаць, каго трэба падтрымаць і што можна на гэтым зарабіць. Такой дзелавой хваткай, хуткай рэакцыяй валодае і В. Баграцоў. Глядзіце: да яго я абышоў 36 малых прадпрыемстваў, дэманстраваў фанаграмы, расказваў і даказваў. Нічога не атрымлівалася: глядзяць на мяне, як на нейкі цуд, ды, відаць, думаюць, навошта звязвацца з такім незразумелым бізнесам. А вось В. Баграцоў адразу ўбачыў камерцыйную перспектыву.

Карэспандэнт: Цікава, як пракаменціруе гэта сам Валерый Канстанцінавіч? Тым больш, што, наколькі мне вядома, у яго ёсць свая ўласная тэорыя адносін у прадпрымальніцтве.

В. Баграцоў (за кадрам): Зноў спашлюся (гэта, прызнаюся, мой пункцік) на вядомага амерыканскага эканоміста псіхалогіі бізнесу Дэйла Карнегі, на яго своеасаблівую тэорыю «кіслага лімона». Коратка яна заключаецца ў наступным. Кожны дзелавы чалавек павінен памятаць: калі ў жыцці яму толькі і дасталося, што «кіслы лімон», то не трэба па-пустому плакацца ў камізэльку, неабходна імкнуцца зрабіць з яго лімонад. Гэта азначае, што трэба любыя абставіны паварочваць на карысць сабе, на карысць справе.

Так і тут: магчыма, хлопцы ў нечым яшчэ і зялёныя, аднак я бачу, што пры ўпартай працы ў рэшце рэшт можа атрымацца нядрэнны «ліманад». І наогул, калі да мяне прыходзяць з дзелавымі прапановамі, я нікога проста так не адштурхоўваю. Мы яшчэ паслужым адзін аднаму. Канцэрты «Інтэрпола», яго замежныя паездкі — гэта ж адначасова і рэклама для маёй фірмы, ці не так? Мы ж падтрымліваем яго фінансамі, і калі гэта мецэнацтва, то на дзелавой, эканамічнай аснове. Такія адносіны я прызнаю.

Карэспандэнт: Адным словам, Віталь, тэарэтычная і фінансавая база вашага супрацоўніцтва падрыхтавана грунтоўна. Можна са спакойнай душой займацца мастацтвам, даваць чарговыя канцэрты — цяпер, наколькі мне вядома, у Палацы культуры Мінскага трактарнага завода. Будзем спадзявацца, што саюз муз і бізнесу прынясе плён абодвум бакам.

В. Дзмітрэнка: Дзякую. Запэўніваю, што ні наш саюзнік-спонсар, ні аматары музыкі ад гэтага не прагадаюць.

Запісаў Валерый ЧАРНЯЎСКІ.

На здымку: рок-група «Інтэрпол».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

ПРАГРАМЕ ДАВЯРАЙ, ДЫ АБ ПРАЦЫ ДБАЙ

Як паведамлялася ўжо, Саўмін рэспублікі зацвердзіў праграму занятасці насельніцтва на гэты год. На думку старшыні Дзяржкамітэта па працы і сацыяльных пытаннях Г. Бадзея, дакумент гэты не чарговая «панацэя» ад усіх бед. Правільней сказаць — гэта план дзейнасці камітэта па прадухіленню масавага беспрацоўя. План тэрміновы, выканання якога можна чакаць толькі пры ўмове нацыянальнай еднасці.

Сапраўды, калі вінаваціць ва ўсіх асабістых няшчасцях вышэйшыя эшалоны ўлады, то неўпрыкмет згубіцца само разумение праблемы, яе размераў і вытокаў. Справа ў тым, што той стан з занятасцю насельніцтва, які склаўся ў васьмідзесятыя, поўнасцю адлюстроўваў стратны шлях развіцця эканомікі. Намаганні выканаўчых органаў улады былі скіраваны на тое, каб як мага паўней забяспечыць народную гаспадарку працоўнымі рэсурсамі. «Рэсурсы» штампаваліся ў «кузнях кадраў» і спрытнымі шарэнгамі ішлі на такія ж «штампаваныя» рабочыя месцы, прычым месц штампавалася значна больш патрэбнага.

Сёння кузня сапсавалася, а многія вырабленыя ёю месцы проста пайшлі на злом. Можна шкадаваць нас, гаротных, што мы нарадзіліся і жывём падчас рэвалюцыі, што многім яна калечыць лёс, закрэсліваё мары, аднак нельга змяніць таго, што ёсць: сёння назад нічога не вернеш і беспрацоўе — рэальнасць.

Па прагнозах камітэта ў гэтым годзе на рынак працы звернецца амаль кожны дзесяты жыхар рэспублікі. У такой сітуацыі Дзяржкамітэт фактычна пераўтвараецца ў камітэт па беспрацоўю. Сёння ад яго патрабуюцца не толькі метадычныя распрацоўкі для дзяржпрадпрыемстваў, але яшчэ ў большай ступені — вычарпальныя меры па прадухіленню сацыяльнай напружанасці. Зрэшты, на гэта і скіравана праграма.

— Мы імкнуліся ў ёй адысці ад прынцыпу тушэння пажару беспрацоўя толькі грашовай дапамогай. Практыка краін са сталымі рыначнымі адносінамі сведчыць: ісці трэба па шляху далучэння беспрацоўнага да актыўнага пошуку выйсця, а гэта, на нашу думку, перанавучанне, павышэнне кваліфікацыі, гэта таксама стымуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці,— лічыць старшыня камітэта.

Каб не здарылася так, што дапамогу па беспрацоўю будуць атрымліваць працуючыя, мяркуецца аўтаматызаваць улік беспрацоўных. Праграмай прадугледжваецца стварэнне банка даных аб усіх жадаючых перасяліцца з гарадоў у сельскую мясцовасць. Адначасова ўзрасце маральна (і, відаць, матэрыяльна) цана свабоднага жылля ў вёсцы, якое плануецца ўлічваць больш дакладна, каб прапанаваць яго продаж ці арэнду бяздомным гараджанам.

Зрэшты, тым, хто ўжо сабраўся рушыць у вёску, можна параіць не спяшацца: праграма мяркуе гэта імкненне матэрыяльна стымуляваць. Сродкі для гэтага будуць шукаць Мінфін, Міністэрства сельскай гаспадаркі, Рэспубліканскі цэнтр занятасці насельніцтва. У адпаведнасці з пастановай Саўміна № 254 ад 28 чэрвеня мінулага года ў хуткім часе належыць вызначыць парадак выдачы беспрацэнтнага крэдыту з Дзяржаўнага фонду занятасці беспрацоўным з мэтай дапамогі ім у арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

Цяжка сказаць, як гэта будзе на практыцы і колькі гадоў беспрацоўнага стажу спатрэбіцца, каб атрымаць гэту дапамогу, але менавіта наш цяперашні ўрад абяцае парадаваць гэтым новаўвядзеннем. Крыху будуць расчараваны сяляне: мяркуецца весці ўлік даходаў, якія яны атрымліваюць ад уласнага падвор'я. Зрэшты, невядома, як гэта адаб'ецца на дачніках, якія страцілі месца работы. Магчыма, морква, агуркі ці бульба, якія яны там вырошчваюць, будуць залічвацца ў якасці асноўнага заработку. Праграма наконт гэтага тлумачэнняў не мае, аднак жартаваць наконт аб'ектыўнасці ацэнкі самога тэрміну «беспрацоўны» няма падстаў. Спецыялісты прадказваюць не проста часовым цяжкасці, а крызісны спад вытворчасці і масавае звальненне працоўных. У першую чаргу за варотамі будуць работнікі прамысловасці, аўтамабільнага транспарту, будаўнічых і праектных арганізацый.

Каб неяк зменшыць сацыяльную напружанасць, на мэты занятасці трэба будзе выдаткаваць амаль два мільярды рублёў, якіх у распараджэнні ўрада можа і не аказацца. У сувязі з гэтым дадатныя моманты праграмы значна гаснуць. Адзначым, што мае яна і шэраг недахопаў. Ці ж можна ўсур'ёз, з пазіцыі рыначных адносін успрымаць той факт, што прадпрыемствам і ўстановам будзе даведзена квота абавязковага прыёму на работу адзінокіх і многадзетных бацькоў, інвалідаў, асоб перадпенсіённага ўзросту і г. д. Надзеі на рэзкі скачок нашай свядомасці наўрад ці апраўданыя. Хутчэй за ўсё, як гэта было і раней, ад гэтай катэгорыі працуючых прадпрыемствы будуць пазбаўляцца ўсімі сродкамі.

У адным з пунктаў праграмы запісана: «У мэтах прадухілення масавага беспрацоўя з прычыны адсутнасці матэрыяльна-сыравінных рэсурсаў і з-за ўнікнення праблем са збытам прадукцыі прыняць меры, а пры неабходнасці ўносіць у Савет Міністраў прапановы па перапрафіляванню прадпрыемстваў». Як вынікае з дакумента, адказваць за гэта будуць усе, акрамя саміх прадпрыемстваў. Зрэшты, сапраўды, каму ў стратнай вытворчасці зараз галава баліць аб агульным інтарэсе. Цяжкая прыватызацыя амаль завершана, многія з кіраўнікоў прыкінулі магчымасці работы ў камерцыйных структурах (а то ўжо і працуюць там). Што ж да рабочых... Відаць, давядзецца ім у лепшым выпадку мяняць молат на серп. Хоць, магчыма, і ў горадзе можна будзе выжыць. Тая ж праграма дае шанц сваёй увазе да прадпрымальніцтва. Сёння, напрыклад, адкрыць сваю справу даволі няпроста. Увесь «стартавы» капітал можна патраціць на атрыманне адной пячаткі. Саюз прадпрымальнікаў, Саюз малых прадпрыемстваў і іншыя «саюзы», прышпілёўшы гучныя назвы, больш дбаюць аб уласных інтарэсах, чым аб інтарэсах тых, чыю назву носяць. У гэтым плане задуму Дзяржкамітэта аб стварэнні гасразліковых укараняльна-кансультацыйных прадпрыемстваў і бюро, якія будуць аказваць паслугі па развіццю прадпрымальніцтва, можна толькі вітаць. Асабліва, калі яны будуць працаваць па дзяржаўных расцэнках і змогуць вырашаць хоць бы два пытанні: складанне статутаў і выраб пячаткі. На жаль, у праграме не знайшло адлюстравання пытанне аб натарыяльце, якое таксама ў многім паралізуе прадпрымальніцтва: актаў засведчваецца столькі, што гэта служба Мінюста не ў стане спраўляцца са сваімі абавязкамі.

Віктар ХУРСІК.

Перспектыўная спецыяльнасць— крок у заўтрашні дзень

Адной з характэрных рыс нашай рэчаіснасці стала імкненне моладзі да авалодання перспектыўнай прафесіяй. Пакуль яшчэ не кожная ВНУ можа задаволіць гэтую патрэбнасць. А вось у Мінскім фадыётэхнічным інстытуце вырашылі ісці ў нагу з часам і да ўжо і так даволі значнага спіса інжынерных спецыяльнасцей дабавілі спецыялізацыю па тэхнічнаму менеджменту.

Наш карэспандэнт пагутарыў з загадчыкам кафедры эканомікі МРТІ Аляксандрам ФЯДЗЕНЕМ аб спецыфічных правілах набору і навучання па гэтай спецыяльнасці.

— Аляксандр Канстанцінавіч, што прымусіла вас адкрыць новую спецыялізацыю?

— Плануючы адкрыццё спецыялізацыі «тэхнічны менеджэр», мы выходзілі з тых рэалій, з якімі сутыкаюцца нашы выпускнікі пасля заканчэння інстытута. Вельмі часта жыццё патрабуе ад іх не толькі дасканалага ведання, напрыклад, асаблівасцей тэхналогіі вытворчасці радыёэлектроннай апаратуры, але і ўмення наладзіць работу творчага калектыву ўкараняльнай групы. Асабліва адчувальную патрэбнасць у такой спецыялізацыі маюць супрацоўнікі малых прадпрыемстваў, якім няма на каго перакласці вырашэнне эканамічных і кіраўніцкіх пытанняў.

— Калі я правільна вас зразумеў, гэта будзе вучэбны курс па асновах прадпрымальніцтва?

— Не зусім так. Арганізацыя і забеспячэнне дзейнасці прадпрыемства, натуральна, будуць вывучацца, але з пункту гледжання менавіта інжынернай дзейнасці. Сваю задачу мы бачым не ў тым, каб перавучваць інжынераў і менеджэраў, а ў тым, каб дапоўніць інжынерную адукацыю сур'ёзнымі ведамі па праблемах эканомікі і кіравання.

— Такая праграма, напэўна, патрабуе прыцягнення спецыялістаў з іншых кафедраў і ВНУ, а таксама спецыялістаў-практыкаў?

— Так, вядома. У нас ужо ёсць пэўны вопыт работы і папярэдняя дамоўленасць са спецыялістамі з Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга і Вільнюса. Акрамя таго, не выключана магчымасць супрацоўніцтва ў рамках гэтай спецыялізацыі з заходнееўрапейскімі навучальнымі цэнтрамі.

**— У такім выпадку гэта, відаць, будзе «дараг

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ СТАТУСЕ НАРОДНАГА ДЭПУТАТА МЯСЦОВАГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гэты Закон у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь вызначае статус народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў як паўнамоцнага прадстаўніка сваіх выбаршчыкаў у калегіяльным органе дзяржаўнай улады, замацоўвае яго правы і абавязкі, стварае неабходныя прававыя гарантыі дэпутацкай дзейнасці.

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Удзел народнага дэпутата ў ажыццяўленні дзяржаўнай улады

Ажыццяўленне мясцовым Саветам народных дэпутатаў функцый дзяржаўнай улады грунтуецца на актыўным і раўнапраўным удзеле ў яго рабоце кожнага народнага дэпутата.

У мясцовым Савеце і яго органах народны дэпутат абмяркоўвае і вырашае пытанні дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва ў адпаведнасці з кампетэнцыяй дадзенага Савета, удзельнічае ў падрыхтоўцы і прыняцці рашэнняў Савета, кантралюе выкананне законаў Рэспублікі Беларусь, іншых актаў вышэйстаячых органаў дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь, а таксама рашэнняў Савета.

Народны дэпутат будуе сваю работу ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, рашэннямі адпаведнага мясцовага Савета, наказамі выбаршчыкаў і са сваёй перадвыбарнай праграмай.

Артыкул 2. Заканадаўства аб статусе народнага дэпутата мясцовага Савета

Статус народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь вызначаецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Законам.

Асобныя пытанні дэпутацкай дзейнасці могуць рэгулявацца іншымі нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама адпаведных мясцовых Саветаў.

Артыкул 3. Паўнамоцтвы народнага дэпутата

Паўнамоцтвы народнага дэпутата пачынаюцца з дня яго выбрання і заканчваюцца ў дзень выбрання дэпутатаў адпаведнага Савета новага склікання або ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 11 гэтага Закона.

Адпаведны Савет па прадстаўленню мандатнай камісіі разглядае пытанне аб паўнамоцтвах дэпутатаў і ў выпадку парушэння заканадаўства аб выбарах прымае рашэнне аб прызнанні выбараў асобных дэпутатаў несапраўднымі.

Пры неабгрунтаванай адмове адпаведнага Савета ў пацвярджэнні паўнамоцтваў выбранага дэпутата канчатковае рашэнне аб прызнанні яго паўнамоцтваў прымае па заключэнню пракурора вышэйстаячы Савет.

Артыкул 4. Спалучэнне дэпутацкай дзейнасці з выкананнем вытворчых і службовых абавязкаў

Народны дэпутат ажыццяўляе свае паўнамоцтвы, як правіла, не парываючы з вытворчай або службовай дзейнасцю.

Артыкул 5. Узаемаадносіны народнага дэпутата з выбаршчыкамі

Народны дэпутат падтрымлівае сувязі з выбаршчыкамі, працоўнымі калектывамі і грамадскімі аб'яднаннямі, якія вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты, а таксама з калектывамі іншых прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, дзяржаўнымі і грамадскімі органамі, размешчанымі на тэрыторыі яго выбарчай акругі.

Народны дэпутат як паўнамоцны прадстаўнік выбаршчыкаў выкарыстоўвае свой статус для забеспячэння гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь правоў і законных інтарэсаў грамадзян, абароны іх годнасці.

Народны дэпутат адказны перад выбаршчыкамі і ім падсправаздачны.

Народны дэпутат, які не апраўдаў даверу выбаршчыкаў, можа быць адкліканы выбаршчыкамі ва ўстаноўленым законам парадку.

Артыкул 6. Узаемаадносіны народнага дэпутата з Саветам і яго органамі

Народны дэпутат, з'яўляючыся членам калегіяльнага прадстаўнічага органа дзяржаўнай улады, валодае ўсёй паўнатой правоў, якія забяспечваюць яго актыўны ўдзел у дзейнасці Савета, утвараемых ім пастаянных камісій, іншых органаў, нясе абавязкі перад Саветам па выкананню прынятых ім у межах сваёй кампетэнцыі рашэнняў.

Мясцовы Савет мае права заслухаць паведамленне народнага дэпутата аб яго рабоце ў Савеце, аб выкананні ім рашэнняў і даручэнняў Савета і яго органаў.

Прэзідыум мясцовага Савета, старшыня Савета, іншыя органы і службовыя асобы Савета абавязаны ствараць народным дэпутатам неабходныя ўмовы для эфектыўнага ажыццяўлення імі дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Артыкул 7. Удзел народнага дэпутата ў рабоце іншых органаў дзяржаўнай улады

Народны дэпутат мае права ўдзельнічаць з правам дарадчага голасу ў рабоце іншых мясцовых Саветаў і іх органаў пры прыняцці імі рашэнняў, якія закранаюць інтарэсы насельніцтва, што пражывае на тэрыторыі таго Савета, у склад якога ён выбраны.

Артыкул 8. Дэпутацкія групы і іншыя дэпутацкія аб'яднанні

Народныя дэпутаты маюць права аб'ядноўвацца для ўзгодненых дзеянняў у Савеце, выбарчых акругах у пастаянныя і часовыя дэпутацкія групы і іншыя аб'яднанні на аснове ўзаемнай згоды.

Парадак дзейнасці дэпутацкіх груп і іншых дэпутацкіх аб'яднанняў, іх правы вызначаюцца рэгламентам адпаведнага Савета, заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні дэпутацкай дзейнасці.

Артыкул 9. Дэпутацкая этыка

Народны дэпутат павінен строга захоўваць нормы дэпутацкай этыкі. Пытанні аб парушэннях дэпутацкай этыкі разглядаюцца адпаведным Саветам ці па яго даручэнню — прэзідыумам або камісіяй, якая спецыяльна ўтвараецца.

Артыкул 10. Абарона правоў, гонару і годнасці народнага дэпутата

Правы, гонар і годнасць народнага дэпутата знаходзяцца пад абаронай дзяржавы.

Народны дэпутат мясцовага Савета карыстаецца дэпутацкай недатыкальнасцю. Недатыкальнасць народнага дэпутата мясцовага Савета заключаецца ў прадастаўленні дзяржавай асобых гарантый абароны асобы дэпутата ад крымінальнага, адміністрацыйнага або дысцыплінарнага праследавання пры ажыццяўленні ім дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Асобы, якія робяць замах на гонар і годнасць народнага дэпутата ці аказваюць супраціў супраўнае ўздзеянне на яго, членаў яго сям'і або сваякоў з мэтай перашкодзіць выкананню дэпутацкіх абавязкаў або супраць волі народнага дэпутата схіліць яго да прыняцця рашэння ў чыю-небудзь карысць, падлягаюць адказнасці ў адпаведнасці з законам.

Артыкул 11. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў народнага дэпутата

Паўнамоцтвы народнага дэпутата спыняюцца датэрмінова па рашэнню адпаведнага Савета ў сувязі:

з выбраннем або назначэннем дэпутата на пасаду, заняцце якой па закону несумяшчальна з выкананнем дэпутацкіх паўнамоцтваў;

з асабістай заявай дэпутата з прычыны абставін, якія перашкаджаюць выкананню паўнамоцтваў, або па іншых асабістых матывах;

з прызнаннем вынікаў выбараў несапраўднымі;

з уступленнем у законную сілу абвінаваўчым прыгаворам суда ў адносінах да асобы, якая з'яўляецца дэпутатам;

са спыненнем грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

II. ДЗЕЙНАСЦЬ НАРОДНАГА ДЭПУТАТА У САВЕЦЕ

Артыкул 12. Удзел народнага дэпутата ў рабоце Савета

На сесіях Савета народныя дэпутаты на аснове калектыўнага, раўнапраўнага і свабоднага абмеркавання разглядаюць і вырашаюць усе пытанні, аднесеныя да ведання адпаведнага Савета.

Народны дэпутат абавязаны ўдзельнічаць у рабоце сесій Савета і ў пасяджэннях яго органаў, у склад якіх ён выбраны або ўваходзіць па пасадзе. У выпадку немагчымасці прыбыць на сесію або пасяджэнне ён павінен паведаміць аб гэтым у прэзідыум Савета (старшыні) або кіраўніку адпаведнага органа Савета.

Пры сістэматычным няўдзеле дэпутата ў рабоце Савета і яго органаў або парушэнні норм дэпутацкай этыкі Савет інфармуе аб гэтым выбаршчыкаў дадзенага дэпутата.

Артыкул 13. Правы народнага дэпутата на сесіі Савета

Народны дэпутат карыстаецца правам рашаючага голасу па ўсіх пытаннях, што разглядаюцца Саветам і яго органамі, у склад якіх ён выбраны або ўваходзіць па пасадзе.

Народны дэпутат мае права:

выбіраць і быць выбраным у органы Савета;

удзельнічаць з правам дарадчага голасу ў рабоце любога ўтворанага Саветам органа;

прапаноўваць пытанні для разгляду Саветам і яго органамі;

уносіць прапановы і заўвагі па павестцы дня сесіі, парадку разгляду і сутнасці пытанняў, якія абмяркоўваюцца;

уносіць праекты рашэнняў і папраўкі да іх;

вылучаць кандыдатуры, у тым ліку і сваю ўласную, у склад органаў, якія ўтвараюцца Саветам;

уносіць прапановы аб заслухоўванні на сесіі Савета справаздачы ці інфармацыі любога органа або службовай асобы, падсправаздачнай ці падкантрольнай Савету;

уносіць прапановы аб вызваленні ад абавязкаў службовых асоб, аб іншых кадравых перастаноўках у падначаленых ці падкантрольных Савету органах;

прапаноўваць да разгляду Саветам пытанні аб правядзенні праверак выканання законаў Рэспублікі Беларусь, рашэнняў адпаведнага Савета падсправаздачнымі органамі кіравання, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, размешчанымі на тэрыторыі Савета;

звяртацца з запытамі, удзельнічаць у абмеркаваннях, задаваць пытанні дакладчыкам і старшынствуючаму на пасяджэнні, даваць ацэнку атрыманым адказам;

выступаць з абгрунтаваннем сваіх прапаноў і па матывах галасавання даваць даведкі;

знаёміцца з тэкстамі сваіх выступленняў у стэнаграмах і пратаколах пасяджэнняў Савета і яго органаў да апублікавання, а таксама атрымліваць тэксты выступленняў, якія не падлягаюць апублікаванню;

апавяшчаць на сесіях Савета звароты грамадзян, якія маюць грамадскае значэнне.

Народны дэпутат па пытанню, якое абмяркоўваецца на сесіі, можа перадаць старшынствуючаму тэкст свайго выступлення, прапаноў і заўваг, што падлягаюць уключэнню ў пратакол сесіі і ўлічваюцца пры прыняцці рашэнняў. У выпадку іх адхілення дэпутату даецца абгрунтаваны адказ.

Народны дэпутат, які не згодны з рашэннем Савета або яго органа, мае пераважнае права на выкладанне сваёй асобай думкі на іх пасяджэннях.

Парадак рэалізацыі ўказаных правоў устанаўліваецца законамі Рэспублікі Беларусь і рэгламентам адпаведнага Савета.

Артыкул 14. Дэпутацкі запыт

Дэпутацкі запыт — заяўляемае народным дэпутатам або групай дэпутатаў на сесіі Савета патрабаванне даць афіцыяльнае растлумачэнне ці выказаць пазіцыю па пытаннях, што датычацца важнейшых грамадскіх інтарэсаў на тэрыторыі Савета. Дэпутацкі запыт уключаецца ў павестку дня сесіі ў парадку, які вызначаецца рэгламентам Савета.

Народны дэпутат або група дэпутатаў маюць права звярнуцца на сесіі з запытам да прэзідыума Савета, старшыні Савета, выканаўчага і распарадчага органа, кіраўнікоў яго структурных падраздзяленняў, а таксама да кіраўнікоў або ўладальнікоў любых размешчаных на тэрыторыі Савета прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый па пытаннях, аднесеных да ведання адпаведнага Савета або закранаючых яго інтарэсы. Запыт можа быць унесены ў вуснай або пісьмовай форме. Запыт, унесены ў пісьмовай форме, падлягае апавяшчэнню на сесіі самім дэпутатам або па яго просьбе старшынствуючым.

Дзяржаўны орган або службовая асоба, да якіх звернуты запыт, абавязаны даць у трохдзённы або іншы ўстаноўлены Саветам тэрмін афіцыяльны адказ. Дэпутат мае права даць ацэнку адказу службовай асобы на запыт. Па выніках абмеркавання запыту прымаецца рашэнне. Запыт, адказ на яго і прынятае Саветам рашэнне даводзіцца да ведама грамадскасці праз сродкі масавай інфармацыі ці іншым шляхам.

Савет мае права абавязаць дзяржаўны орган або службовую асобу прадставіць да ўстаноўленага тэрміну справаздачу аб выкананні рашэння па дэпутацкаму запыту.

Асобы, да якіх звернуты дэпутацкі запыт, нясуць устаноўленую законам адказнасць за своечасовасць, паўнату і праўдзівасць прадстаўленай на запыту інфармацыі.

Артыкул 15. Парадак разгляду прапаноў і заўваг народных дэпутатаў, унесеных на сесіі Савета

Прапанова і заўвагі, выказаныя дэпутатам на сесіі Савета або перададзеныя ў пісьмовай форме старшынствуючаму на сесіі, разглядаюцца Саветам ці пастаяннымі камісіямі або накіроўваюцца імі на разгляд адпаведным дзяржаўным, грамадскім органам і службовым асобам.

Дзяржаўныя і грамадскія органы, а таксама службовыя асобы, якім накіраваны прапановы і заўвагі дэпутатаў, унесеныя на сесіі Савета, абавязаны разгледзець іх не пазней чым у месячны тэрмін і аб выніках паведаміць пісьмова непасрэдна дэпутатам, а таксама старшыні або прэзідыуму Савета, выканаўчаму і распарадчаму органу.

Кантроль за разглядам і рэалізацыяй прапаноў і заўваг дэпутатаў ажыццяўляецца прэзідыумам і пастаяннымі камісіямі Савета.

Артыкул 16. Удзел народнага дэпутата ў рабоце органаў Савета

Народны дэпутат, які ўваходзіць у склад прэзідыума і іншых органаў Савета, мае права ўносіць любыя пытанні і прапановы на разгляд указаных органаў, удзельнічаць у падрыхтоўцы іх да разгляду, у іх абмеркаванні і прыняцці па іх рашэнняў, а таксама ў арганізацыі ажыццяўлення рашэнняў Савета і яго органаў і ў кантролі за іх выкананнем.

Народны дэпутат, які не згодны з рашэннем органа Савета, у склад якога ён выбраны або ўваходзіць па пасадзе, мае права выказаці свой пункт гледжання на сесіі Савета або паведаміць аб ім у пісьмовай форме старшынствуючаму.

Народны дэпутат, які не ўваходзіць у склад органа Савета, можа прымаць удзел у яго пасяджэннях, уносіць прапановы, удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў, якія разглядаюцца, і прыняцці рашэнняў з правам дарадчага голасу. У выпадку нязгоды з рашэннем органа Савета дэпутат можа ўнесці сваю прапанову ў пісьмовай форме ў якасці папраўкі да праекта рашэння. Папраўкі, унесеныя дэпутатам, разглядаюцца органам Савета, і па іх праводзіцца галасаванне.

Па рашэнню Савета дэпутат можа быць выведзены са складу органаў Савета за сістэматычны няўдзел у іх рабоце.

Артыкул 17. Удзел народнага дэпутата ў праверках работы дзяржаўных і грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый

Па даручэнню Савета, яго органаў або па ўласнай ініцыятыве дэпутат можа ўдзельнічаць у праверках работы размешчаных на тэрыторыі Савета дзяржаўных і грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый па пытаннях, якія адносяцца да ведання Савета, знаёміцца з неабходнымі дакументамі. Аб выніках праверкі дэпутат інфармуе Савет або яго органы, а таксама адпаведныя дзяржаўныя і грамадскія органы, прадпрыемствы, установы, арганізацыі і ў выпадку неабходнасці ўносіць прапановы аб паляпшэнні іх работы, ліквідацыі выяўленых недахопаў, адмене незаконных рашэнняў, прыцягненні да адказнасці асоб, вінаватых у парушэнні дзяржаўнай дысцыпліны і законнасці.

Народны дэпутат мае права ўнесці ў Савет і яго органы пытанне аб неабходнасці правядзення праверак работы дзяржаўных і грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі выбарчай акругі, і патрабаваць іх вырашэння. Гэтыя органы абавязаны загадзя паведамляць дэпутату аб разглядзе такіх пытанняў;

правяраць з прыцягненнем пры неабходнасці спецыялістаў кантрольна-рэвізійных і праваахоўных органаў, грамадскасці звесткі аб парушэннях законаў, правоў і законных інтарэсаў грамадзян і арганізацый, праяўленнях валакіты і бюракратызму, якія сталі яму вядомымі са зваротаў грамадзян, арганізацый і іншых крыніц, атрымліваць неабходную для гэтага інфармацыю, патрабаваць ад адпаведных органаў і службовых асоб ліквідацыі выяўленых парушэнняў;

праводзіць сходы (канферэнцыі) выбаршчыкаў акругі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі і мясцовымі органамі грамадскіх арганізацый;

удзельнічаць у рабоце розных аб'яднанняў народных дэпутатаў, выбаршчыкаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, у сходах гаспадарчага актыву, працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый, грамадзян па месцы жыхарства і ваеннаслужачых па воінскіх часцях.

Народны дэпутат у Рэспубліцы Беларусь мае пераважнае права выступаць па пытаннях сваёй дэпутацкай дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі, якія засноўваюцца адпаведным Саветам. Рэдагаванне прадстаўленых дэпутатам для апублікавання матэрыялаў без узгаднення з ім не дапускаецца.

Артыкул 20. Абавязкі народнага дэпутата ў сувязі з работай у выбарчай акрузе

У сваёй выбарчай акрузе народны дэпутат абавязаны:

рэгулярна інфармаваць насельніцтва аб рабоце Савета, аб выкананні плянаў і праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця, рашэнняў Савета, наказаў выбаршчыкаў, а таксама сваёй перадвыбарнай праграмы;

удзельнічаць у арганізацыі і кантролі выканання законаў Рэспублікі Беларусь, іншых актаў вышэйстаячых органаў дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь, рашэнняў Савета і яго органаў;

вывучаць грамадскую думку, патрэбы і запатрабаванні насельніцтва, паведамляць аб іх Савету і яго органам, іншым дзяржаўным і грамадскім арганізацыям, прадпрыемствам і ўстановам, уносіць прапановы, прымаць меры для іх задавальнення, умацавання дысцыпліны і правапарадку;

садзейнічаць развіццю розных форм самакіравання, сацыяльнай актыўнасці грамадзян, уцягненню іх у кіраванне дзяржаўнымі і грамадскімі справамі;

рэгулярна, не радзей аднаго разу ў месяц, ажыццяўляць прыём грамадзян.

Артыкул 21. Разгляд народным дэпутатам прапаноў, заяў і скаргаў грамадзян

Народны дэпутат разглядае ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку прапановы, заявы і скаргі выбаршчыкаў, якія паступілі да яго, забяспечвае правільнае і своечасовае іх вырашэнне, вядзе прыём грамадзян на тэрыторыі сваёй выбарчай акругі, вывучае грамадскую думку, уносіць прапановы ў адпаведны Савет, а пры неабходнасці — у іншыя дзяржаўныя і грамадскія органы. Ён мае права запрашаць для ўдзелу ў прыёме грамадзян службовых асоб дзяржаўных і грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі выбарчай акругі.

Народны дэпутат мае права ажыццяўляць кантроль за разглядам накіраваных ім прапаноў, заяў і скаргаў у дзяржаўных і грамадскіх органах, прадпрыемствах, установах і арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі Савета, і прымаць асабісты ўдзел у іх разглядзе.

Службовыя асобы дзяржаўных і грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі адпаведнага Савета, абавязаны аказваць дэпутату дапамогу ў яго кантрольнай дзейнасці.

Артыкул 22. Справаздачы народнага дэпутата перад выбаршчыкамі, сустрэчы з імі

Народны дэпутат мясцовага Савета перыядычна, але не радзей двух разоў у год, абавязаны рабіць справаздачу перад выбаршчыкамі акругі, працоўнымі калектывамі і грамадскімі аб'яднаннямі, якія вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты, аб сваёй рабоце, аб ходзе выканання перадвыбарнай праграмы і рэалізацыі наказаў выбаршчыкаў.

Справаздача дэпутата можа быць праведзена таксама па патрабаванню групы выбаршчыкаў колькасцю, устаноўленай адпаведным Саветам. У гэтым выпадку прэзідыумы, старшыні мясцовых Саветаў народных дэпутатаў прымаюць меры, неабходныя для арганізацыі нечарговай справаздачы народнага дэпутата, не пазней чым за месяц да правядзення нечарговай справаздачы паведамляюць дэпутату аб часе і месцы яе правядзення, аб прычынах, што паслужылі для гэтага падставай.

Справаздачы дэпутата праводзяцца на сходах выбаршчыкаў, якія склікаюцца з гэтай мэтай, а таксама на канферэнцыях дэлегатаў ад выбаршчыкаў адпаведнай выбарчай акругі.

Сход (канферэнцыя), на якім заслухоўваецца справаздача дэпутата, можа прымаць рашэнне, што эмяшчае прапановы і заўвагі дэпутату, якія даводзяцца да ведама выбаршчыкаў акругі.

Мясцовыя органы дзяржаўнай улады праз сродкі масавай інфармацыі, заснаваныя Саветамі, забяспечваюць асвятленне справаздач дэпутатаў.

Артыкул 23. Садзейнічанне народнаму дэпутату ў правядзенні справаздач і сустрэч з выбаршчыкамі

Народнаму дэпутату забяспечваюцца неабходныя ўмовы для справаздач і сустрэч з выбаршчыкамі акругі. Па яго просьбе прэзідыум (старшыня) адпаведнага Савета, адміністрацыя прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый выдзяляюць памяшканні, паведамляюць грамадзянам аб часе і месцы правядзення справаздачы дэпутата або сустрэчы з выбаршчыкамі, накіроўваюць па запрашэнню дэпутата для ўдзелу ў сустрэчы сваіх прадстаўнікоў, аказваюць іншую дапамогу.

Па патрабаванню народнага дэпутата дзяржаўныя органы, прадпрыемствы, установы, арганізацыі, размешчаныя на тэрыторыі Савета, прадастаўляюць яму неабходныя для справаздачы і выступленняў на сустрэчах з выбаршчыкамі даведачныя і інфармацыйныя матэрыялы, за выключэннем звестак, якія складаюць дзяржаўную ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам.

Артыкул 24. Звароты народнага дэпутата

Народны дэпутат мае права звяртацца ва ўсе дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, прадпрыемствы, установы і арганізацыі, да службовых асоб па пытаннях, звязаных з дэпутацкай дзейнасцю ў сваёй акрузе, і прымаць удзел у разглядзе пастаўленых пытанняў. Аб дні разгляду дэпутату павінна быць паведамлена загадзя. Указаныя органы і службовыя асобы абавязаны даць дэпутату адказ на яго зварот у тэрмін і парадку, прадугледжаным для вырашэння скаргаў, заяў і прапаноў грамадзян.

Артыкул 25. Права народнага дэпутата на неадкладны прыём службовымі асобамі

Па пытаннях дэпутацкай дзейнасці дэпутат карыстаецца правам бесперашкоднага наведвання на тэрыторыі Савета дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх органаў і арганізацый, а таксама правам неадкладнага прыёму іх кіраўнікамі і іншымі службовымі асобамі.

Парадак наведвання народным дэпутатам арганізацый, дзейнасць якіх звязана з дзяржаўнай і іншай тайнай, што ахоўваецца законам, устанаўліваецца законам.

Артыкул 26. Права народнага дэпутата патрабаваць ліквідацыі парушэнняў законнасці

Выявіўшы парушэнне правоў і інтарэсаў грамадзян, якія ахоўваюцца законам, або іншыя парушэнні законнасці, народны дэпутат як прадстаўнік дзяржаўнай улады мае права на месцы патрабаваць спынення парушэння, а ў неабходных выпадках звярнуцца з патрабаваннем да адпаведных органаў і службовых асоб спыніць такія парушэнні. Факт парушэння можа фіксавацца ў пратаколе, складзеным дэпутатам, або па яго патрабаванню — прадстаўніком адпаведнага праваахоўнага ці кантрольнага органа.

Службовыя асобы дзяржаўных і грамадскіх органаў, адміністрацыя прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама работнікі праваахоўных органаў, да якіх звернута патрабаванне дэпутата, абавязаны без прамаруджвання прыняць меры для ліквідацыі парушэння, а пры неабходнасці — для прыцягнення вінаватых да адказнасці з наступным інфармаваннем аб гэтым дэпутата. У выпадку непрыняцця мер службовыя асобы нясуць дысцыплінарную ці крымінальную адказнасць ва ўстаноўленым законам парадку.

IV. АРГАНІЗАЦЫЯ РАБОТЫ З НАКАЗАМІ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Артыкул 27. Наказы выбаршчыкаў народнаму дэпутату

Наказамі народнаму дэпутату мясцовага Савета з'яўляюцца даручэнні, выказаныя выбаршчыкамі і прынятыя кандыдатам у народныя дэпутаты, па пытаннях дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва, рэалізацыя якіх адносіцца да ведання адпаведнага мясцовага Савета і яго органаў.

Кандыдат у народныя дэпутаты мае права не прыняць у якасці наказу даручэнне, унесенае сходам (канферэнцыяй) выбаршчыкаў, калі яно супярэчыць яго перадвыбарнай платформе, дзеючаму заканадаўству, або па іншых абгрунтаваных прычынах, што адлюстроўваецца ў пратаколе схода (канферэнцыі) выбаршчыкаў.

Артыкул 28. Падрыхтоўка і прыняцце рашэнняў па наказах выбаршчыкаў

Абагульненне і папярэдні разгляд наказаў выбаршчыкаў ажыццяўляюцца прэзідыумамі, выканаўчымі і распарадчымі органамі мясцовых Саветаў.

Выканаўчыя і распарадчыя органы мясцовых Саветаў з улікам заўваг пастаянных камісій Саветаў рыхтуюць зводныя планы мерапрыемстваў па выкананню наказаў выбаршчыкаў і прадстаўляюць іх на разгляд адпаведных Саветаў.

Пры прыняцці Саветам рашэння аб немэтазгоднасці або немагчымасці выканання асобных наказаў выбаршчыкаў народны дэпутат мае права паставіць пытанне аб дадатковым іх вывучэнні і ўнясенні на паўторны разгляд Савета.

Саветы народных дэпутатаў улічваюць наказы выбаршчыкаў пры распрацоўцы планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, мэтавых праграм і складанні бюджэту. Меры па іх рэалізацыі выдзяляюцца ў планах і бюджэце ў спецыяльны раздзел.

Артыкул 29. Арганізацыя выканання наказаў выбаршчыкаў

Выкананне наказаў выбаршчыкаў, прынятых да выканання мясцовымі Саветамі, забяспечваюць іх выканаўчыя і распарадчыя органы.

Кантроль за выкананнем наказаў выбаршчыкаў ажыццяўляецца мясцовымі Саветамі, камісіямі адпаведных Саветаў і народнымі дэпутатамі.

Выканаўчыя і распарадчыя органы не радзей аднаго разу ў год дакладваюць Саветам аб ходзе выканання рашэнняў па наказах выбаршчыкаў.

Прапановы, выказаныя ў ходзе перадвыбарных сустрэч з кандыдатамі, не выбранымі ў выніку выбараў дэпутатамі, накіроўваюцца выбарчымі камісіямі ў адпаведныя органы і службовым асобам для разгляду і прыняцця мер. Аб выніках разгляду і рэалізацыі такіх прапаноў прэзідыумы (старшыні) мясцовых Саветаў інфармуюць грамадзян.

Артыкул 30. Удзел народнага дэпутата ў рабоце з наказамі выбаршчыкаў

Народны дэпутат удзельнічае ў распрацоўцы і абмеркаванні плана мерапрыемстваў па рэалізацыі наказаў выбаршчыкаў, ажыццяўляе кантроль за іх выкананнем, рэгулярна інфармуе выбаршчыкаў аб ходзе выканання наказаў.

Па даручэнню Савета або яго органаў, а таксама па сваёй ініцыятыве дэпутат праводзіць праверкі выканання наказаў выбаршчыкаў. Аб выніках праверак дэпутат інфармуе Савет або яго органы, а таксама выбаршчыкаў.

Артыкул 31. Галоснасць у рабоце з наказамі выбаршчыкаў

Рашэнні Савета, прынятыя па наказах выбаршчыкаў, падлягаюць апублікаванню.

Ход выканання наказаў выбаршчыкаў асвятляюць сродкі масавай інфармацыі, заснаваныя мясцовымі Саветамі.

V. АСНОЎНЫЯ ГАРАНТЫІ ДЭПУТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Артыкул 32. Забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення народным дэпутатам яго паўнамоцтваў

Саветы народных дэпутатаў, іншыя дзяржаўныя і грамадскія органы, прадпрыемствы, установы, арганізацыі і іх службовыя асобы ствараюць належныя ўмовы для ажыццяўлення дэпутатамі іх паўнамоцтваў.

Прэзідыум Савета (старшыня), выканаўчы і распарадны орган Савета забяспечваюць дэпутатам магчымасць карыстацца службовымі памяшканнямі, бібліятэчнымі фондамі і архівамі, сродкамі сувязі, электронна-вылічальнай, арганізацыйнай, капіравальна-размнажальнай і друкарскай тэхнікай, якая ёсць у Савеце.

Дзяржаўныя і грамадскія органы, прадпрыемствы, установы і арганізацыі, размешчаныя на тэрыторыі Савета, садзейнічаюць народным дэпутатам пры ажыццяўленні дэпутацкай дзейнасці ў прадастаўленні транспарту, забеспячэнні ў нечарговым парадку гасцініцамі.

Артыкул 33. Вызваленне народнага дэпутата ад выканання вытворчых або службовых абавязкаў

На час сесій Савета, а таксама для ажыццяўлення дэпутацкіх паўнамоцтваў у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, дэпутат вызваляецца ад выканання вытворчых або службовых абавязкаў на тэрмін і ў парадку, які вызначаецца Саветам.

За ўвесь перыяд вызвалення на падставе заявы народнага дэпутата яму выплачваецца сярэдняя заработная плата і кампенсуюцца камандзіровачныя расходы па месцы работы або службы. Дадзеныя расходы пакрываюцца арганізацыямі за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту.

Артыкул 34. Права народнага дэпутата на атрыманне інфармацыі і кансультацый. Аказанне дэпутату юрыдычнай дапамогі

Дзяржаўныя і грамадскія органы, адміністрацыя прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі Савета, абавязаны па просьбе дэпутата забяспечыць яго кансультацыямі спецыялістаў па пытаннях, звязаных з дэпутацкай дзейнасцю, і прадстаўляць неадкладна, а пры адсутнасці такой магчымасці — не пазней чым у двухтыднёвы тэрмін неабходную яму інфармацыю.

Прэзідыум (старшыня), выканаўчы і распарадчы орган Савета, адміністрацыя прадпрыемстваў, арганізацый, навуковых, юрыдычных, навучальных устаноў, праваахоўныя органы абавязаны аказваць народнаму дэпутату дапамогу па прававых пытаннях, якія ўзнікаюць у яго дэпутацкай дзейнасці.

Артыкул 35. Права народнага дэпутата на бясплатны праезд

Народны дэпутат абласнога, раённага, гарадскога, раённага ў горадзе, пасялковага і сельскага Савета карыстаецца адпаведна на тэрыторыі вобласці, раёна, горада, пасёлка і сельсавета правам бясплатнага праезду на ўсіх відах транспарту, за выключэннем таксі і транспартных сродкаў, якія належаць грамадзянам на праве прыватнай уласнасці, а таксама правам нечарговага атрымання праязных дакументаў.

Парадак і ўмовы бясплатнага праезду народных дэпутатаў мясцовых Саветаў, звязаных з гэтым разлікі з транспартнымі арганізацыямі вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 36. Гарантыі працоўных правоў народнага дэпутата

Народны дэпутат у перыяд сваіх паўнамоцтваў, а таксама на працягу аднаго года пасля іх заканчэння не можа быць па ініцыятыве адміністрацыі звольнены з работы на прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі, выключаны з калгаса, іншага кааператыва, навучальнай установы або пераведзены ў парадку дысцыплінарнага спагнання на ніжэйаплатную работу (паніжаны па пасадзе) без папярэдняй згоды Савета.

Народны дэпутат з ліку ваеннаслужачых і іншых катэгорый грамадзян, служба якіх рэгулюецца статутамі і палажэннямі, у перыяд сваіх паўнамоцтваў, а таксама на працягу аднаго года пасля іх заканчэння не можа быць па ініцыятыве адміністрацыі або камандавання звольнены са службы, паніжаны па пасадзе, а таксама перамешчаны па службе без яго згоды. Яму не можа быць затрымана прысваенне чарговага воінскага або роўнага воінскаму спецыяльнага звання згодна з займаемай пасадай.

Дэпутату, вызваленаму ад вытворчых або службовых абавязкаў, з прычыны выбрання яго ў склад Савета і яго органаў, па заканчэнні тэрміну паўнамоцтваў прадастаўляецца ранейшая работа (служба) або пры яе адсутнасці — іншая раўназначная работа (служба). Кантроль за працаўладкаваннем дэпутата ажыццяўляе адпаведны мясцовы Савет.

Час работы дэпутата ў Савеце і яго органах залічваецца ў агульны і бесперапынны стаж работы, стаж работы (службы) па спецыяльнасці.

Артыкул 37. Недатыкальнасць народнага дэпутата

Народны дэпутат абласнога, раённага, гарадскога, раённага ў горадзе, пасялковага, сельскага Савета народных дэпутатаў не можа быць на тэрыторыі адпаведнага Савета прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, арыштаваны або падвергнуты мерам адміністрацыйнага спагнання, якія накладваюцца ў судовым парадку, без згоды Савета, у які ён выбраны.

Крымінальная справа ў адносінах да дэпутата абласнога і Мінскага гарадскога Саветаў можа быць узбуджана пракурорам адпаведна вобласці, горада Мінска або вышэйстаячым пракурорам, а ў адносінах да дэпутата раённага, гарадскога, раённага ў горадзе, пасялковага, сельскага Савета — пракурорам адпаведнага раёна, горада або вышэйстаячым пракурорам.

На тэрыторыі адпаведнага Савета не дапускаецца прывод народнага дэпутата, а роўна агляд яго асабістых рэчаў, багажу, транспарту, жылога або службовага памяшкання. Гэты парадак распаўсюджваецца на перапіску, сродкі сувязі, якія выкарыстоўваюцца народным дэпутатам, а таксама на дакументы, што належаць дэпутату.

Артыкул 38. Парадак разгляду пытання аб пазбаўленні дэпутацкай недатыкальнасці народнага дэпутата мясцовага Савета

Для атрымання згоды на прыцягненне дэпутата да крымінальнай адказнасці, арышт ці прымяненне мер адміністрацыйнага спагнання, якія накладваюцца ў судовым парадку, пракурор уносіць прадстаўленне ў Савет, у які выбраны народны дэпутат.

У выпадку прыцягнення да крымінальнай адказнасці, арышту ці прымянення мер адміністрацыйнага спагнання, што накладваюцца ў судовым парад

РОЗГАЛАС

СПАЧАТКУ ТРЭБА ДАКАЗАЦЬ...

ПІНСК. (У. Равіцкі). На гэты год у дапамогу пінскім фермерам дзяржава бясплатна выдзеліла 800 тысяч рублёў. У раёне ёсць 6 фермерскіх гаспадарак, і першыя 200 тысяч ужо размеркаваны паміж імі. Грошы пайшлі на карэннае паляпшэнне выдзеленай зямлі — на меліярацыю, вапнаванне, набыццё ўгнаенняў, а таксама будаўніцтва падаёмаў, электрыфікацыю. На закупку тэхнікі сродкі будуць выдзелены толькі пасля выканання неабходных мерапрыемстваў на зямлі. Зразумела, такі падыход некалькі абмяжоўвае ініцыятыву саміх фермераў. Але зараз, відаць, без гэтага не абысціся. Ва ўсім свеце ад кожнага, хто пажадаў стаць фермерам, патрабуецца доказ сур'ёзнасці яго намераў і магчымасцей.

ТРАНСПАРТ. ПАДАРАЖАННЕ НЕПАЗБЕЖНАЕ

Як нам паведамілі ў камерцыйным аддзеле ўпраўлення гарадскога транспарту, падарожанне на грамадскім транспарце непазбежнае. Наколькі даражэй будуць гэтыя паслугі, залежыць ад датацый Савета Міністраў РБ на гэты сродак руху. «Вілка» мяркуемай цаны аднаго талончыка ў тралейбусе ці аўтобусе — ад 60 капеек да 3 рублёў. У метро праезд, паводле прагнозаў эканамістаў, будзе больш танным.

Хутчэй за ўсё мы прыйдзем да «цывілізаванай» цаны за праезд, якая на ўсім свеце вельмі салідная. Напрыклад, у Ізраілі адна паездка ў грамадскім транспарце раўнацэнная пуховай кофтачцы, у Польшчы ж — тры талончыкі складаюць эквівалент пляшкі польскага піва.

А. КОКТЫШ.

Мал. Мікалая СЯЎЛЮКА.

КУРС ВАЛЮТ

ПА СТАНУ НА РАНІЦУ 15 КРАСАВІКА 1992 ГОДА
(Першая лічба — скупка, другая — продаж)

	Фірма «АНАТС» (г. Рыга)	Банк «Комплекс» (г. Мінск)
Долар ЗША	126—135	126—128
Марка Германіі	75— 81	70— 73
Аўстралійскі долар	82—105	—
Брытанскі фунт	187—236	200—205
Фінская марка	23,7— 30	24— 26
Французскі франк	19— 22	20— 22
Канадскі долар	87—112	—

БелаПАН.

ЗА РАДКОМ ДЗЯРЖКАМСТАТА

ХТО СТАПТАЎ НАШЫ ЧАРАВІКІ?

Як паведамляе Дзяржкамстат, летась абутковыя прадпрыемствы рэспублікі вырабілі 45 мільёнаў пар скуранога абутку (дарэчы, паняцце «скураны» ахоплівае як абутак з верхам з натуральнай скуры, так і абутак з верхам з тэкстылю, штучнай скуры і камбінаваным верхам). Пры гэтым 34,5 мільёна пар, або 82,6 працэнта выпушчанага абутку, пастаўлена гандлёвым арганізацыям рэспублікі. Згодна з тымі ж данымі, летась, у параўнанні з пазалеташнім годам, вытворчасць абутку скарацілася нязначна — на 3,8 працэнта, 1 ўжо толькі за два сёлетнія месяцы (у адносінах да мінулага года) яна з'ехала ўніз ажно на 15 працэнтаў. Летась у разліку на душу насельніцтва вытворчасць абутку складала 4,4 пары — трэцяе месца сярод краін Садружнасці пасля Арменіі і Малдовы. Яго вырабляецца на душу насельніцтва больш, чым у Балгарыі, Польшчы, Венгрыі, Румыніі...

Адным словам, такія вось даныя, якія, можа, і не вельмі саграваюць ногі, бо, як вядома, у магазінах і цяпер, пасля лібералізацыі, выбіраць амаль няма чаго. Да таго ж гэты выбар нярэдка абмежаваны яшчэ і зусім нізкай якасцю (яўны разлік вытворцаў на тое, што ва ўмовах дэфіцыту «ўсё пойдзе». І ідзе, а куды ж дзявацца спажыўцу?)

Аднак удакладнім даныя Дзяржкамстата разлікамі інстытута кан'юнктуры і попыту: рацыянальныя нормы забеспячэння абуткам наступныя — 5,8 пары на чалавека. Гэта з улікам гумавага абутку. А калі браць толькі так званы скураны (з тым жа тэкстыльным верхам), то норма — 4,67 пары.

Але што ж атрымліваецца? Вытворцы даюць амаль норму. Хто ў такім выпадку носіць нашы чаравікі? Няхай сабе з тым жа тэкстыльным верхам?

Зрэшты, можа сагрэемся весткай аб тым, што мы апярэдзе Балгарыі, Польшчы і г. д. А што яшчэ застаецца?

Кар. «Звязды».

НАС ЧАКАЕ ПАЛІТЫЧНЫ СТРЫПТЫЗ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Уладзімір Новік:

— У першую чаргу вам трэба ўрэгуляваць прававы статус усіх народных дэпутатаў. Трэба даць магчымасць усім жадаючым прафесійна выконваць свае абавязкі. І тут ніякіх супярэчнасцей з Канстытуцыяй я не бачу. У аснове работы парламента павінна ляжаць не структура падзялення на камісіі, а структура падзелу на палітычныя фракцыі. Гэта — аснова любога еўрапейскага парламента.

...Наслухаўшыся дыскусій і дэбатаў, народны дэпутат Віктар Ганчар прама ад першага мікрафона, устаноўленага ў зале Вярхоўнага Савета, сказаў, што, мяркуючы па ўсяму, нас чакае палітычны стрыптыз. А гэта ўжо цікава...

Праект пастановы Вярхоўнага Савета «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Часовы рэгламент Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь», прапанаваны аб'яднаннем «Беларусь», накіраваны на дапрацоўку. Прыняцце яго будзе нялёгкім. А што, уласна кажучы, сёння ў нас даецца лёгка?!

Анатоль МЯСНІКОЎ.

НЕ ЎСЁ ТАК ДРЭННА...

ГРОДНА. (Б. Пракопчык). Напярэдадні пасяўной кампаніі гучала шмат песімістычных прагнозаў. Аднак чуткі аб магчымай катастрофе былі некалькі перабольшанымі. Прынамсі, пакуль што сельскія працаўнікі Прынёманскага краю працуюць не горш, чым летась. Як паведаміў рэдакцыі намеснік начальніка аддзела па вытворчасці і перапрацоўцы прадукцыі раслінаводства абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Б. Мартонік, па стану на 14 красавіка засеяна 138,6 тысячы гектараў зерневых — гэта 55 працэнтаў ад усёй плошчы, а ў Мастоўскім і Шчучынскім раёнах — звыш 80 працэнтаў. На гэтым тыдні там разлічваюць завяршыць сяўбу. Такім чынам, у параўнанні з мінулым годам тэмпы работ не толькі не знізіліся, а нават павялічыліся.

— Невырашальных праблем на пасяўной пакуль што не ўзнікае, — гаворыць Б. Мартонік. — Адзінае, што трывожыць, — гаспадаркам няма чым разлічвацца за бензін, тона якога цяпер каштуе 9,5 тысячы рублёў. Трэба браць крэдыт. Аднак калі і як яго вярнуць?

А як жа справы ў фермераў? У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванню нас запэўнілі, што ўсе заяўкі фермераў на транспарт, гаручае, угнаенні і насенне (за выключэннем бульбы) выкананы.

Адпраўляйся, «Віталія», у Італію

Народныя дэпутаты аршанскіх раённага і гарадскога Саветаў выступілі з заявай, у якой запатрабавалі забараніць будаўніцтва ў Оршы гарбарнай вытворчасці «Віталія».

Спрэчкі «за» і «супраць» будаўніцтва разгарэліся не сёння. На Аршаншчыне і без таго цяжкая экалагічная абстаноўка, а вычышчальныя збудаванні, якія збіраецца паставіць італьянскі бок, не адпавядаюць патрабаванням яховы навакольнага асяроддзя. Прыемна, канешне, пафранціць у італьянскім абутку, ды толькі ў тым выпадку, калі на здароўе не скардзішся.

Юрый КАРМАНАЎ.
БелаПАН.

ФЕРМЕРАЎ ПАЛЯЦЬ?

Паводле даных Сялянскага саюза Беларусі, у Слуцкім раёне быў падпалены дом фермера Міхаіла Сокалава.

Тры гады будаваў ён сваё жыллё, і вось, здавалася, будаўніцтва закончана. Фермер ужо сабраўся перабірацца са сваёй сям'ёй у новы дом, але адбылося самае нечаканае — пажар знішчыў усю пабудову. Фермер лічыць, што гэта не проста няшчасны выпадак, а падпал. Трэба адзначыць, што дом не быў застрахаваны. Паводле інфармацыі Сялянскага саюза, аналагічны выпадак адбыўся ў мінулым годзе ў Бярозаўскім раёне.

А. ГРУЗДЗІЛОВІЧ (РІД).

МАЛЮНКІ З НАРВЕГІІ

Прымерым скандынаўскі варыянт

Шэсць месяцаў прапрацаваў я ў Нарвегіі. Чалавек хутка прывыкае да добрага. Да чыстых вуліц і паркаў, поўных прылаўкаў, ветлівых людзей. Усё з часам становіцца звычайным, нават будзённым. Адыходзіць здзіўленне, пачынаецца асэнсаванне. Канешне, шэсць месяцаў мала нават для таго, каб усё даведацца пра аднаго чалавека. Не гаворачы ўжо пра цэлую краіну. Але я не прэтэндую на глыбокі аналіз. У сябе дома ніяк не можам разабрацца. А тут — іншая дзяржава.

Думаю, кожны, хто з галоднай Расіі ўпершыню прыбывае ў Нарвегію, як і ў любую высокаразвітую заходнееўрапейскую краіну, у першую чаргу кідаецца да магазінных вітрын. І магазінна-прылавачнае ўражанне доўга потым мучыць нашага грамадзяніна пасля вяртання на радзіму, не дае спаць. Зноў і зноў ўзнікае пытанне: і чаму ў іх гэтулькі багацця?

Было б паўбяды, каб прылавачнае ўспрыманне Захаду раніла толькі душу радавога нашага грамадзяніна, не збалаванага замежнымі паездкамі. Яно, на жаль, часцей за ўсё прэваліруе ў галовах людзей, прэтэндуючых у нас на ролю аракулаў — палітычных, эканамічных, публіцыстычных.

Сёмы год на розных трыбунах, у газетах і часопісах, на вулічных мітынгах ідзе няспынная славесная мітусня вакол пераходу да рынку. Калі падсумоўваеш тое, пра што гавораць, робіш вывад: вось пяройдзем хутка, у кароткія тэрміны да рынку — настане ўсеагульнае шчасце. Не настане. Прынамсі, усеагульнае.

Ну, чаму ў нас так любяць дурыць людзям галовы? Семдзесят гадоў абяцалі светлую камуністычную будучыню, цяпер — яшчэ больш светлае капіталістычнае заўтра. Канешне, патрэбен рынак. Гэта—аксіёма, натуральнае развіццё эканомікі. Пры ўмове, што рынак цывілізаваны. Але нават калі гэта і так, дык паняцце «рынак» усё роўна зусім не адэкватнае паняццю шчасця. Рынак — не самамэта, а толькі сродак. Мэта павінна быць адна — чалавек.

Дай Бог, калі ў нас пасля пераходу да рынку не будзе калумбійскага варыянта капіталізму. Набярэмся цярпення, спішам сённяшнія цяжкасці на чарговы ў нашай гісторыі пераходны перыяд. Так, сёння мы жудасна выглядаем нават на фоне краін трэцяга свету. Гэта калі для больш 80 працэнтаў грамадзян цэны сталі не па кішэні. Сёння пацерпім, а заўтра, магчыма... А што заўтра? Шведскі ці нарвежскі варыянт? Каб жа Богу ў вушы...

Паверыць, канешне, цяжка. Але давайце абстрагуемся і паверым, што мы жывём у Нарвегіі, у краіне з прылаўкамі, якія ломяцца ад тавараў. Так, тут чалавека паважаюць, так, тут дэмакратыя, так, тут ёсць усё. Але... Ці для ўсіх? Ці ёсць усеагульнае шчасце?

Неяк у першыя дні камандзіроўкі на адной з вуліц Осла мяне спыніла маладая, гадоў трыццаці нарвежка і папрасіла 3 кроны. Каб жа гэта быў адзіны выпадак...

Будучы ў камандзіроўцы ў шведскім горадзе Гётэборгу, разгаварыўся з Мікаэлай, дзяжурным адміністратарам гасцініцы. Атрымлівае яна 50 крон у гадзіну. За месяц набіраецца прыкладна 9 тысяч. Па нашых паняццях — шалёныя грошы. А для шведаў? 4 тысячы Мікаэла плаціць за камунальныя паслугі ва ўласным доме, 2 тысячы ў якасці падатку дзяржаве. Кілаграм мяса каштуе ў Швецыі, як і ў Нарвегіі, у сярэднім 80—120 крон, рыбы—40—100 крон, бохан хлеба — 6—20 крон, дзіцячая каляска — 2,5—4 тысячы крон, самы танны аўтамабіль «Лада—Самара» — 84 тысячы, дарагі і больш за паўмільёна пацягне. Добра, што ў Мікаэлы муж багаты. А каб і ён зарабляў столькі ж, як яна? А такія сем'і — не рэдкасць.

Але не да шчасця трэба рыхтаваць людзей, а да цяжкай работы, да штодзённага падліку кожнай капейкі, строгага планавання дамашняга бюджэту — на месяцы і гады наперад.

— Збіраюся я купіць новы тэлевізар, — расказваў мне высокапастаўлены супрацоўнік нарвежскай паліцыі. — Ведаю, што мне яго ўдасца набыць толькі праз год. Кожны месяц строга падлічваем расходы, каб адкласці нейкую суму на вялікую пакупку.

Яшчэ раз паўтаруся: на Захадзе ёсць абсалютна ўсё. Былі б грошы. А грошы даюцца нялёгка. У такой пурытанскай краіне, як Нарвегія, дзе не ўбачыш па тэлевізары голай жанчыны, няцяжка сустрэць на вуліцах начнога горада прадстаўніц самай старажытнай прафесіі, хоць афіцыяльных публічных дамоў няма. «Начныя матылькі» Осла, як, відаць, і любога іншага горада, распазнаюцца адразу. Ды яны і не ўтойваюць сваё рамяство, нягледзячы на пільнасць паліцыі маралі.

— Ты хочаш? — спыталася ў мяне адна маладая асоба на вуліцы Толбугата ў Осла.

— Пагаварыць хачу з табой. Я журналіст.

Крысцін, як назвалася мая субяседніца, выдала мне ўсю калькуляцыю свайго рамяства. За «аднаразовае каханне» яна бярэ 400 крон, плюс 200—за кантакт (як таксіст за пасадку), яшчэ плюс 300—за месца, калі яго няма ў кліента. За кожнае наступнае «каханне» — яшчэ па 200 крон.

Крысцін 25 гадоў, бацьку яна не памятае, маці кінула яе шмат гадоў назад. Выхоўвалася дзяўчынка ў дзіцячым доме. Цяпер жыве ў інтэрнаце, працуе раз у тыдзень. Атрымлівае каля 3 тысяч крон. А гады ж— маладыя. Апранацца хочацца. Боты каштуюць недзе амаль тысячу крон, куртка, не скураная, — за тысячу. Вось і пайшла на панель. Патрэбны грошы.

Людзей, асабліва маладых, якія, як Крысцін, маюць у Нарвегіі няпоўны рабочы тыдзень — не адна сотня тысяч. А зарэгістраваных на пачатак года беспрацоўных налічваецца 160 тысяч. Перакладзём на маштабы Беларусі — 400 тысяч атрымаецца. Вядома, ёсць дапамога, э голаду не памрэш. Але...

Бачыць чалавек вакол сябе шыкоўныя лімузіны, наведвальнікаў рэстаранаў, велізарныя вілы. На жаль, не кожнаму гэта дадзена. Грошы, грошы, грошы... Без іх — ні кроку. Вялікія грошы робяць яшчэ больш вялікія. Усё ў банках, на рахунках. Ніхто табе не пазычыць проста так, па-суседску. Можа, толькі пад працэнты, як у банку.

Ці гатоў наш народ да такой рэзкай змены псіхалогіі? Я не ўпэўнены. Ці ўлічваюць нашы вялікія рэфарматары чужы вопыт, ці прымаюць пад увагу нацыянальныя традыцыі, характар народнай душы? Не, яны здольныя толькі абяцаць людзям багатыя прылаўкі. Праз дзікі рынак. А ў дзікім рынку, як у дзікім лесе, слабыя гінуць. Выжываюць мацнейшыя.

Без прагматызму, канешне, здаровую эканоміку пабудаваць немагчыма. Але прагматызм на Захадзе запаланіў усе сферы жыцця. Памятаю, як скардзілася былая масквічка, якая выйшла замуж за нарвежца:

— Уяўляеш, прыходзіць да нас у госці сябар мужа. Як толькі муж на хвілінку выйшаў на кухню, ён адразу ж пачаў прапаноўваць мне спаткацца. Паабяцаўшы 3,5 кроны за адно спатканне. Вось так ён мяне ацаніў.

Колькі ні сустракаў рускіх эмігрантаў, пераконваўся: не прыжылася іх душа на нарвежскай глебе. Так, жывуць сытна, так, ніколі не вернуцца яны ў нашу бедную краіну. Але ў душы ўсё ж застануцца ізгоямі. Раней, чытаючы падобныя думкі ў савецкіх газетах, прымаў іх за прапаганду. На жаль...

Колькі б мы ні захапляліся, і зусім заслужана, Захадам, яго ўклад жыцця нельга, як па кальцы, перанесці на праект зусім яшчэ незразумелага новага грамадскага ладу, што зараджаецца ў нас. Дай Бог, канешне, дасягнуць нам некалі такога ўзроўню жыцця, як у Нарвегіі. Асабліва такой высокай ступені сацыяльнай абаронасці. Тут бясплатныя медыцына, адукацыя. Тут вельмі добрае пенсіённае забеспячэнне, цудоўныя дамы для састарэлых. Але нават у такім грамадстве, на жаль, ёсць людзі неўладкаваныя. І пакуль хоць бы адзін чалавек будзе спаць на вакзале, што я таксама бачыў у Осла, грамадства будзе далёкае ад ідэалу.

Пішу гэтыя радкі і думаю: а ці правільна зразумее мяне чытач? Ці не прыме за журналіста э эпохі застою, калі прафесіянальныя інтарэсы савецкага карэспандэнта за мяжой круціліся вакол аднаго і таго ж беспрацоўнага Джона з Нью-Йорка ці галадаючага фізіка, які шмат разоў пазіраваў маскоўскаму тэлеаператару? Я пішу гэта толькі для таго, каб растлумачыць людзям: не трэба цешыць сябе абяцаннямі пасткамуністычных рэфарматараў наконт усеагульнага шчасця праз рыначную эканоміку. Трэба рыхтаваць людзей да цяжкай працы і да асабістай адказнасці за сваю будучыню. Тады і багатыя прылаўкі з'явяцца. Самі па сабе. А раю на зямлі пакуль што няма. Нідзе.

Міхаіл БАЦЯН.

УРАДАВАЯ ХРОНІКА

Курс на прынятую ў міжнароднай практыцы сістэму ўліку і статыстыкі

Улічваючы тыя абставіны, што існуючая цяпер статыстыка не дае поўнага ўяўлення аб эканоміцы рэспублікі, аб стане рынку працы, капіталу, тавараў і паслуг, плацежнага балансу, бюджэту і ў цэлым фінансавых рэсурсаў, дзейнасці новых рыначных структур, а таксама не дазваляе аб'ектыўна ацэньваць працэсы станаўлення рынку і выпрацоўваць меры па яго развіццю, перабудове кіравання народнай гаспадаркай, умацаванню міждзяржаўных сувязей шляхам выкарыстання метадалогіі, якая прымяняецца ў статыстыцы і ўліку зарубежных краін, Савет Міністраў вырашыў стварыць такую сістэму статыстыкі, якая адпавядала б новым эканамічным адносінам, забяспечвала аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў і выпрацоўку спосабаў уздзеяння на іх.

У адпаведнай пастанове зроблена даручэнне Дзяржкамстату, Міністэрству фінансаў з удзелам Дзяржэканомплана, Нацыянальнага банка, Акадэміі навук, міністэрстваў, ведамстваў і навукова-даследчых арганізацый у трохмесячны тэрмін падрыхтаваць і падаць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь для зацвярджэння праграму перабудовы ўліку і статыстыкі, пераходу на сістэму нацыянальных падлікаў, прымяняемую ў іншых краінах, прывядзення ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі бухгалтарскага ўліку і ўсіх эканоміка-статыстычных паказчыкаў. Адначасова будзе арганізавана работа па стварэнню з 1 студзеня 1993 г. адзінага дзяржаўнага рэгістра прадпрыемстваў і арганізацый усіх форм уласнасці і гаспадарання.

У сувязі з пераходам на прынятую ў міжнародай практыцы сістэму ўліку і статыстыкі ўзрастуць патрабаванні да падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў па статыстыцы, эканамічнаму аналізу і бухгалтарскаму ўліку. У якасці базавых навучальных устаноў падрыхтоўкі такіх спецыялістаў устаноўлены Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт і вучэбны камбінат Дзяржкамстата. Міністэрству адукацыі даручана з улікам міжнародных стандартаў унесці змяненні ў вучэбныя планы, праграмы і падручнікі па статыстыцы, бухгалтарскаму ўліку і іншых дысцыплінах для студэнтаў эканамічных і інжынерна-эканамічных спецыяльнасцей вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

У некалькі радкоў

*Савет Міністраў пастанавіў упаўнаважыць міністра аховы здароўя Казакова Васілія Сцяпанавіча падпісаць ад імя урада Рэспублікі Беларусь Пагадненне аб каардынацыі міждзяржаўных адносін у галіне аховы здароўя Садружнасці Незалежных Дзяржаў і дакументы, якія з яго вынікаюць.

*Урад прыняў распараджэнне аб камандзіраванні на 14 дзён у Злучаныя Штаты Амерыкі У. Марчанкі, загадчыка аддзела навукі і новай тэхнікі Кіраўніцтва спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Мэта камандзіроўкі— прапрацоўка пытанняў, звязаных з прыцягненнем перадавых тэхналогій амерканскіх фірм для ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і ўзгаднення адпаведных кантрактаў.

*Для завяршэння навучання слухачоў былога інстытута паліталогіі і сацыяльнага ўпраўлення ўрадам вырашана пералічыць у 1992 годзе з грашовых сродкаў КПБ—КПСС, якія знаходзяцца на спецыяльным рахунку Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Мінадукацыі 3 млн. рублёў, Акадэміі ўпраўлення пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь — 1,2 млн. рублёў.

*Для набыцця запасных частак да імпартнага абсталявання Крычаўскаму заводу гумавых вырабаў урад выдзеліў 2,4 тыс. долараў ЗША.

*Згодна з распараджэннем Савета Міністраў у 1992 годзе выдзелена Мінадукацыі на распрацоўку праекта Закона «Аб правах дзіцяці» 47 тыс. рублёў.

Агляд падрыхтаваны службай інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

ЗАМЕЖЖА

СНЕДАННЕ НА ТРАВЕ

АБІДЖАН. Не чакалі аматары экзотыкі з Бельгіі, што снеданне на ўлоні прыроды ў адным з маляўнічых куткоў Сенегала скончыцца для іх на бальнічным ложку. На апетытны пах прысмакаў і іншай разнастайнай яды, выцягнутай турыстамі, умомант эляцеліся шматлікія трапічныя насякомыя. Чужаземцаў абляпіў цэлы рой злых афрыканскіх пчол, вядомых агрэсіўнасцю і лютасцю далёка за межамі кантынента.

У жаласным выглядзе, з апухлымі тварамі і канечнасцямі ўсе турысты былі змешчаны ў бальніцу ў Дакары. Многія пацыенты знаходзяцца ў цяжкім стане.

ШОСТАЕ МЕСЦА У СПІСЕ СМЕРЦІ

ВАШЫНГТОН. За апошнія два гады колькасць хворых на СНІД амерыканскіх юнакоў і дзяўчат ва ўзросце да 20 гадоў узрасла на 70 працэнтаў. І цяпер гэта хвароба займае шостае месца ў спісе прычын смерці сярод маладых людзей гэтага ўзросту. Такія даныя прыводзяцца ў распаўсюджаным тут у суботу дакладзе спецыяльнага камітэта па праблемах дзяцей, моладзі і сям'і палаты прадстаўнікоў кангрэса ЗША.

АКІЯН АДДАСЦЬ ДАЎГІ..

МАДРЫД. Больш за 100 залатых дублонаў удалося дастаць групе даследчыкаў з трумаў іспанскага галеона «Прэсіда», які затануў у 1792 годзе ў водах Атлантычнага акіяна, непадалёк ад берагоў Уругвая, паведаміла агенцтва ЭФЭ з Монтэвідэо. Паводле даных вучоных, на борце карабля, патопленага марскімі піратамі, знаходзіцца мноства манет, залатая статуя Дзевы Марыі і іншыя каштоўнасці, якія ацэньваюцца ў 400 млн. долараў.

Галеон «Прэсіда», пра які ходзіць мноства легенд, на працягу доўгага часу адшукваўся шукальнікамі скарбаў. Знайсці яго ўдалося дзякуючы дапамозе адной з уругвайскіх сем'яў, у якой ад далёкіх продкаў захаваліся дакументы, дазволіўшыя вызначыць месца гібелі галеона.

Гісторыкі сцвярджаюць, што ў мінулым ля ўзбярэжжа Уругвая затанула некалькі караблёў, пад абломкамі якіх і на сённяшні дзень знаходзяцца каштоўнасці і іншыя помнікі старажытнасці, якія ўяўляюць цікавасць для археолагаў.

МУЗЕЙ У ЗАНЯПАДЗЕ

«Усяго пакаленне назад сюды прыходзілі сем'ямі. Таты і мамы з дзецьмі цешыліся скульптурамі вялікіх памераў пад адкрытым небам, любаваліся сакавітымі фарбамі карцін. Тут жа прадаваліся настольныя гульні, створаныя мастакамі-дызайнерамі ў адзіным экземпляры...» Вось што піша пра Цэнтр мастацтваў Уокера і размешчаны побач з ім парк сучаснай архітэктурнай скульптуры ў горадзе Мінеаполісе часопіс «Ньюсуік».

Сёння, у перыяд абвастрэння сацыяльных праблем, супермодныя скульптуры, колеры і фарбы авангарда, архітэктурныя празмернасці выклікаюць у прахожых пачуцці, далёкія ад мастацтва. Таму не хапае сродкаў для таго, каб частнова абнавіць экспазіцыю, зрабіць неабходную рэарганізацыю, пабудаваць будынак...

У мінулым годзе музей у Мінеаполісе быў дзесятым у краіне па колькасці наведванняў — 683 тысячы, — і гэта не ў самым густанаселеным раёне ЗША. Сваёй папулярнасцю музей абавязаны яго дырэктару Марціну Фрыдману, які нядаўна пакінуў гэты пост. Кэці Халбрэйс, якая змяніла яго, трэба будзе зрабіць многае, каб пераважыць цяжкія часы. Яна спадзяецца падтрымліваць на ўзроўні музейную гаспадарку.

НА ЗДЫМКУ: былы дырэктар Уокераўскага цэнтра мастацтваў у Мінеаполісе Марцін Фрыдман.

Вялікай папулярнасцю ў шматлікіх турыстаў карыстаецца сістэма падземных пячор Віамала-Горг, размешчаных у швейцарскім кантоне Грызон. Экзатычнай асаблівасцю пячор з'яўляюцца глыбокія вертыкальныя шахты, якія ідуць у глыбіню на сотні метраў.

НА ЗДЫМКУ: назіральная пляцоўка ў пячорах Віамала-Горг.

«ДЫСНЕЙЛЕНД» У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ. Першы на Еўрапейскім кантыненце парк «Дыснейленд» гасцінна расчыніў свае дзверы перад 60 тысячамі дарослых і дзяцей. Ён пабудаваны на маляўнічай украіне горада Марн-ла-Вале, размешчанага непадалёк ад Парыжа.

Марн-ла-Вале стаў чацвёртым горадам на планеце — пасля Лос-Анджэлеса, Арланда і Тоніо, дзе гасцей чакаюць дзіўныя прыгоды ў свеце казак і сустрэчы з забаўнымі персанажамі з мультфільмаў амерыканца Уолта Дыснея. Будаўніцтва французскага «Дыснейленда» пачалося дзякуючы прынятаму ў 1985 годзе амерыканскай кампаніяй «Уолт Дысней» рашэнню пабудаваць такі парк забаў дзе-небудзь у Еўропе. Выбар выпаў на Францыю.

За 4 гады кампаніі «Еўрадысней» удалося стварыць першы парк забаў на трэці выдзеленай пад «Еўрадыснейленд» плошчы, роўнай амаль 2 тысячам гектараў. Другі комплекс будзе адкрыты праз тры гады. Тады, як заявіў прэзідэнт кампаніі «Еўрадысней» Раберт Фітцпатрык, французскі «Дыснейленд» зможа забаўляць штогод 11 мільёнаў наведвальнікаў.

НЯЎДАЛЫ ЭМІГРАНТ

ТЭЛЬ-АВІЎ. Жарабец арабскай крыві, які стаў у апошнія дні «зоркай» ізраільскай прэсы, вернуты ў чацвер у Іарданію. У мінулы аўторак конь, які належаў брату іарданскага караля наследнаму прынцу Хасану, збег з канюшні ў чырванаморскім порце Акаба і, пераадолеўшы ўплаў больш за два кіламетры, выскачыў на пляж паблізу ізраільскага горада Эйлат. У чацвер з дапамогай афіцэра ААН конь быў пераведзены цераз граніцу і ўручаны іарданскаму боку.

Па матэрыялах інфармацыйных агенцтваў і друку.

«ГАРАЧЫЯ» СЛЯДЫ — ВЕРНЫЯ СЛЯДЫ!

За мінулыя суткі ў горадзе зарэгістраваны 43 злачынствы, 13 з якіх раскрыты па «гарачых» слядах. Учынена адно забойства, чатыры крадзяжы (усе апошнія раскрыты), адно згвалтаванне (раскрыта), сем крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці (раскрыты тры), 14 крадзяжоў асабістай маёмасці (раскрыты два). Раскрыты злачынствы, звязаныя з фальшываманецтвам, нанясеннем цялесных пашкоджанняў, а таксама пяць злачынстваў, здзейсненых раней.

За п'янства былі затрыманы 133 чалавекі, 43 дастаўлены ў медвыцвярэзнік. За парушэнне правілаў дарожнага руху затрыманы 1.197 чалавек, выяўлены 14 нецвярозых вадзіцеляў аўтатранспарту.

ВУЧЫСЯ, СТУДЭНТ! І ЗАМЫКАЙ ДЗВЕРЫ...

Магчыма, 24-гадоваму В., калі ён знаходзіўся ў сябе дома ў Кітаі, нават у галаву не прыходзіла, што з яго незакрытага жылля могуць «свіснуць» рэчы. Стаўшы студэнтам першага курса Мінскага інстытута замежных моў і адначасова жыльцом інтэрната гэтай ВНУ, наваяўленаму студэнту прыйдзецца прывыкнуць да паняццяў «ключ», «дзвярны замок» і «зладзеі». Справа ў тым, што ўчора з яго незакрытага пакоя «выпарыліся» тры пары красовак.

...24-гадовы бабруйчанін Б., які праходзіў міма пакоя (невядома, адкуль ён тут узяўся), добра ведаў, што красоўкі кітайскай вытворчасці — адны з лепшых у свеце...

Б. змешчаны ў ізалятар.

ЧОРТ СПАКУСІЎ?

ГРОДНА. Кульмінацыйнага пункта дасягнуў канфлікт каля Беларускага музея гісторыі рэлігіі ў Гродна. Мясцовы аблвыканком прыняў рашэнне аб перадачы яго праваслаўнай епархіі. Прычым ніякага іншага памяшкання музею не прадастаўляецца. Вольна або не гэтае рашэнне справакавала захоп будынка веруючымі сілай, а па вялікаму рахунку — канфлікт паміж інтэлігенцыяй і вернікамі. А як вядома, на знішчэнні ачагоў культуры духоўнасць не пабудуеш.

БелаПАН.

ПАЖЫВЁМ—ПАБАЧЫМ

ТАЛАЧЫН (Т. Махтадуй). Напэўна, з часоў, апісаных у рамане М. Шолахава «Узнятая цаліна», не было на вёсцы такой мітусні, як сёння. Селянін зноў пастаўлены перад выбарам, якой дарогай пайсці, каб выжыць: падрад, арэнда, асацыяцыя, кааператывы, таварыствы... Галава круціцца.

Члены калгаса імя Заслонава на справаздачным сходзе аднадушна выказаліся за захаванне калектыўнай гаспадаркі, але пры долевай форме ўласнасці, каб кожны меў свой пай. Адсюль і ўзнікла думка ператварыць калгас у сельскагаспадарчае калектыўнае прадпрыемства.

Не так даўно яго падзялілі на два. Адно з новых сельгаспрадпрыемстваў атрымала назву «Машэрава». Да яго перайшлі вёскі і землі, якія ўваходзілі некалі (да аб'яднання з заслонаўцамі) ў калгас імя Свярдлова. Акрамя сельгасугоддзяў, падзелены таксама жывёла, тэхніка, насенне, іншыя асноўныя фонды. Што ж, калгасы сёння свабодныя ў сваёй дзейнасці. Вось толькі што гэта прынясе? Але пажывём — пабачым.

У «ВЕКТАРСА» СВОЙ ВЕКТАР

Беларускі дзіцячы фонд прымаў днямі прэзідэнта амерыканскай арганізацыі «Вектарс інтэрнешнл» Джэймса Аспіна.

Мэта яго візіту — дзелавая сустрэча з кіраўніцтвам Дзіцячага фонду. Абмяркоўваліся пытанні арганізацыі стажыроўкі нашых спецыялістаў - медыкаў у замежных клініках, іншыя перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва з гэтай уплывовай арганізацыяй. Госць пазнаёміўся з работай рэспубліканскага дыягнастычнага цэнтра «Антычарнобыль», анкалагічнага дзіцячага аддзялення ў Бараўлянах.

РІД.

СЁННЯ І ЗАЎТРА

ПОЛАЦК. На сённяшні дзень у Полацку зарэгістраваны 142 беспрацоўныя.

Паводле прагнозаў гарадскога цэнтра занятасці, да канца года гэта лічба можа павялічыцца да 4 тысяч.

«У Афганістан з рыдлёўкай, а не з аўтаматам»

Інтэрв'ю са старшынёй міжнароднага фонду «Адраджэнне Афганістана» Уладзімірам КАРПУХІНЫМ

— Апошнім часам утварылася столькі розных фондаў, арганізацый і карпарацый, што радавому падаткаплацельшчыку робіцца млосна ад адной толькі колькасці новых структур.

— Наш фонд — не даніна сённяшняй модзе. Гэта заканамерны вынік руху, які падспудна прысутнічаў у душы кожнага воіна-афганца. У краіны вялікая віна перад Афганістанам. Тут аднымі словамі аб прызнанні гэтай віны і пакаянні не абысціся. Патрэбны канкрэтныя дзеянні па ўсямернаму садзейнічанню народу Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан у аднаўленні разбуранай у выніку вайны народнай гаспадаркі.

— Маюцца на ўвазе вузка спецыфічныя паслугі па разміраванню небяспечных месц?

— Месцазнаходжання многіх мінных палёў проста ніхто не ведае. І цяпер, калі яшчэ фактычна вядзецца грамадзянская вайна, нам будзе цяжка вызначыцца ў сваёй сапёрнай палітыцы, хоць, вядома, без сапёраў у Афганістане нельга абысціся нават пры будаўніцтве зусім мірных грамадзянскіх аб'ектаў. Менавіта апошняму мы ўдзяляем сваю асноўную ўвагу. У Кабуле дагэтуль няма цэнтральнага водаправода і каналізацыі. Што ўжо тут можна гаварыць пра іншыя гарады і правінцыі? Афганістану проста да зарэзу патрэбны спецыялісты практычна ва ўсіх галінах.

— І якую колькасць добраахвотнікаў мяркуе сабраць ваш фонд?

— Калі ўлічыць, што ў Камбоджы на аднаўленчых работах працавалі 22 тысячы чалавек, а Афганістан па плошчы ў тры разы большы, то лічыце— недзе каля 60 тысяч. Вядома, мы ў першую чаргу разглядаем заявы воінаў-афганцаў, якія ідуць сотнямі. Адзін палкоўнік, камандзір сапёрнага палка, які заяваў у Афганістане, запэўніў, што, калі трэба, ён прывядзе на зборны пункт увесь свой полк. Шлюць заявы і 14-гадовыя хлопчыкі, якія таксама хочуць працаваць у Афганістане.

Эмблема фонду.

— І вы ўсур'ёз іх разглядаеце?

— Вядома, не. У нас узроставая мяжа — 18 гадоў. Усім жадаючым рассылаем анкеты, потым разглядаем іх ужо запоўненыя. А ўвогуле ў нас вельмі жорсткі адбор і ў фізічным, і ў прафесіянальным плане.

— Я так зразумеў, што ваш фонд ужо набраў значныя абароты, калі вядзецца сур'ёзная гутарка аб фарміраванні і накіраванні цэлых брыгад у Афганістан?

— Мы існуем усяго месяц. І за гэты час атрымалі «дабро» не толькі ў Міністэрстве юстыцыі, але і ў Міністэрстве замежных спраў, ды і ўвогуле нам грэх на некага ці нешта скардзіцца. Справа пайшла. Мы ўжо заручыліся падтрымкай А. Бонэр і А. Руцкога. На чарзе М. Гарбачоў, В. Быкаў, І. Шамякін, Бэйкер, папа рымскі і г. д. А таксама краін: Пакістан, Іран, Кітай, ЗША, Англія, ну, і сам Афганістан, вядома.

— А чаму Англія, Кітай?

— Кітай, Іран і Пакістан — суседзі. Англія мае значны ўплыў на гэтую краіну. Калі ўжо эймацца справай, за якую мы ўзяліся, дык толькі ўсур'ёз.

— Суседзі—гэта добра, але галоўны ваш «кантакцёр», на мой погляд, афганская апазіцыя.

— Усё правільна. Адзін з асноўных лідэраў маджахедаў — Хекмацяр сам патрабуе ўдзелу нашай краіны ў аднаўленні Афганістана. Я не сказаў бы, што ў нас усталяваліся вельмі трывалыя сувязі з апазіцыяй, але пэўныя захады ўжо зроблены, і не без поспеху.

— Захады зроблены, добраахвотнікі хоць сёння гатовы кінуцца ў аднаўленчы бой, візавы рэжым спрыяе, справа зусім за «малым» — грашыма?

— Я не стаў бы так іранічна ставіцца да гэтага боку нашага фонду. Па-першае, на наш рахунак ужо первлічылі даволі значную суму грошай некаторыя буйныя прадпрыемствы і арганізацыі. І зрасходаваны яны будуць з толкам. Па-другое, ААН проста павінна пайсці нам насустрач як краіне, якой патрэбна ўдарнай працай замаліць свае грахі перад Афганістанам. Лепш патраціць 5—6 мільярдаў долараў на аднаўленчую праграму з удзелам нашых спецыялістаў, чым траціць дзесяткі мільярдаў долараў на барацьбу з наркабізнесам.

— ???

— Афганістан у руінах. Што рабіць дэхканіну, каб падняць сваю гаспадарку? Перад ім паўстае вельмі спакуслівы шлях — пасеяць каноплі. Далейшае, думаю, зразумела. Дык, можа, лепш даць гэтаму дэхканіну зерне і жывёлу, а спецыялістам-валанцёрам—неблагую зарплату ў валюце? Рызыка і добрасумленная праца павінны добра і аплачвацца.

Гэтая задумка набывае яшчэ большую важкасць у сувязі з тэндэнцыяй да беспрацоўя. Усё ж праца ў Афганістане — гарантаваны неблагі кавалак хлеба.

— Прабачце за рэзкасць, але ці не стане ён комам у горле, гэты кавалак, пасля таго, што мы там нарабілі?

— У 1981 годзе пад Баграмам віцэ-прэзідэнт нашага фонду Сяргей Кузьмоў лятаў у верталётнай эскадрыллі, у якой было шмат нашых саветнікаў. Эскадрылля займалася выключна перавозкамі прадуктаў харчавання, лякарстваў і інш. Дык вось, за 2 гады працы ў эскадрыллі не быў збіты ніводны верталёт.

Канешне, небяспека пэўная ёсць, але гэта нас не пужае. Мы хочам прыйсці ў гэтую краіну не з аўтаматам, а з рыдлёўкай.

Паведамляем адрас фонду: г. Магілёў, вул. Ленінская, 10.

Інтэрв'ю правёў Аляксандр КОКТЫШ.

НЕЗАЛЕЖНАЯ СІСТЭМА

«АЛІСА»

СПАДАРЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ!

Вы жадаеце працаваць у сістэме «Алісы»?!

Няма праблем!

І няма неабходнасці купляць месца

ГАНДЛЁВЫ ДОМ

«БЕСТ»

ВАША ВІЗІТНАЯ КАРТКА Ў «АЛІСУ»

ПОСПЕХАЎ ВАМ, СПАДАРЫ!

Рэспубліка Беларусь. Мінск, вул. Жылуновіча, 15, п. 706.

Тэл. 45-01-13, 45-15-66, 45-76-89.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. СЫЧОВА

ПЕРШЫ КВАРТАЛЬНЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 11



Белыя: Крb5, Сd8, Кb6, пп: d7, h3 (5).
Чорныя: Крh7, Ке4, п. b2 (3).
Выйгрыш.

Заданне № 12

Белыя: Кра7, Ле7, Лg5, Сb3, пп: b2, e6 (6).
Чорныя: Крс8, Фd8, пп: b3, d3, e5 (5).
Выйгрыш.

ЗВЕРЦЕ РАШЭННІ

Заданні № 5 і № 6 першага квартальнага конкурсу рашэнняў разглядаюцца наступным чынам:

№ 5. Р. Колын. 1. Лее3! 1... Крb3 2. Лс4. 1... Крd2 2. d4.

№ 6. Ю. Ляляшнін. 1. Фb6! 1... d3 2. Фd2. 1... f4 2. Фh3.

Правільныя адказы на задачы прыслалі наступныя ўдзельнікі: В. Лашмановаў, М. Сігневіч, У. Сакалоў, А. Кіслы, А. Якімовіч, В. Емяльянаў, М. Губчык, Л. Шацько, А. Рослік, Ю. Белазуб, В. Быкаў, С. Гурыновіч, Я. Лазараў, Л. Ахрэм, А. Кавецкі, У. Баранаў, В. Каваленка, В. Зелянкоўскі, С. Нагурны, І. Лыка, М. Пархоменка і іншыя.

ІДЭІ КАМБІНАЦЫЙ

Шахматысты недаюць, што амаль кожная згулянная партыя абавязкова звязана з камбінацыяй, у якой праходзіць тактычная ідэя ахвяры. Прыводзім асноўныя ідэі: адцягненне, прываблівание, знішчанне абаронца, захоп пункта, вызваленне вертыкалі, вызваленне дыяганалі, вызваленне поля, блакіроўка, перакрыццё, ізаляцыя і разбурэнне.

Усе гэтыя ідэі і іх спалучэнні ўзнікаюць у камбінацыях з дапамогай розных ахвяр і сустракаюцца часта.

Пазнаёмцеся з партыяй, згуляной паміж М. Талем і А. Суэцінным, у якой праходзіць спалучанне ідэй.

Белыя: Крg1, Фh5, Лd2, Лf1, Сd3, Се3, пп: a2, c2, c3, e6, g2, h2 (12).
Чорныя: Крe8, Фc7, Лa8, Лh8, Ке5, Ке7, пп: a6, b5, d6, f7, g6, h7 (12).

Ход белых.

Кароль чорных яшчэ не зрабіў ракіроўкі, і белыя выкарысталі гэтую акалічнасць для атрымання рэальнай карысці.

1. Ф:e5! de. Ахвярай ферзя белыя «раскрываюць» гульню ў цэнтры, знішчаючы галоўную дзеючую асобу ў абароне чорных, і адначасова адцягваюць пешку d6 з цэнтральнай вертыкалі.

2. ef+ і чорныя здаліся. На 1... Крd7 белыя згуляюць 3. С:f5+ Крсе8 4. Се4+ і г. д.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

16 красавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Гімназісты». Тал. дак. фільм.
9.35. «Слова ў слова». Фільм-канцэрт.
9.55. «Гу-га». Мастацкі фільм 1-я і 2-я серыі.
16.30. Беларуская літаратура. 9-ы клас.
17.00. «Вер-не-вер». Мультфільм.
17.20. Дзіцячая тэлефілармонія.
18.00. «Спадчына». Дак. фільм.
18.25. Факты і меркаванні.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. Тыдзень беларускага ўрада.
19.55. «Праз усю вайну». Муз. фільм.
20.15. Калыханка.
20.35. Аб'яднанне «Крок» прадстаўляе... Студыя «Сэнс».
22.20. Ніка.
22.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільмы «Каменная кветка», «Запіскі Піната».
8.05. Канцэрт ансамбля «Харошкі».
8.50. «Справа Сухаво-Кабыліна». Фільм другі.
10.00. Брэйн-рынг.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
12.10. З анталогіі твораў для аркестра народных інструментаў.
12.55. Дак. фільм «Аўчарка».
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. «Я хачу ўбачыць музыку...»
14.55. «Мая жонка — бабуля». Маст. фільм.
16.00. «Знаёмцеся з Японіяй».
17.00. Навіны.
17.25 «Гісторыя без слоў». Мультфільм.
17.30. «Мафія саўгаснага маштабу».
17.55. ...Да 16 і старэйшым.
18.35. «Справа Сухаво-Кабыліна». Фільм другі.
19.45. Добрай ночы, малышы
20.00. Навіны.
20.40. Аўтарская праграма Юліяна Паніча «Дарога дамоў».
22.00. Дак. фільм «Адраджэнне нацыі» (1947—1948 г.г.) з серыі «Вогненны слуп».
23.00. Навіны.
23.25. Дзевятка.
23.55. Футбол. На шляху да Уэмблі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.55. Вольны час. «ТБ»-атэлье».
8.10. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
8.40. Руская мова.
9.10. «Меліхаўскі летапісец».
9.35. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. «Дынамо» (Кіеў) — «Спарта» (Прага).
11.05. Азіярыса, Расія! Паэт Ганна Баркова.
11.35. Д. Сэлінджэр. «Лапа-расціпа».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Музычны клас. «Дзеці для дзяцей... і дарослых».
15.45. Першы тайм.
16.00. Вольны час. «ТБ-атэлье».
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Непазнаны Сусвет.
17.45. Крымінальныя весткі.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
18.55. Рэклама.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Праграма «ЭКС».
19.40. Пятае кола.
20.10. «Начны сеанс». Маст. фільм.
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.30. Рок-канцэрт Барыс Грабеншчыкоў.

17 красавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Дархан». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 9-ы клас.
9.30. «Зноў чую голас твой». Фільм-канцэрт.
10.05. «Гадзінік спыніўся апоўначы». Маст. фільм.
11.45. Дж. Расіні. «Стабат Матэр».
16.30. Для школьнікаў. Скарбы беларускай гісторыі.
16.55. Фільм — дзецям. «Шэсць снежных дзён».
18.00. Дак. фільмы «Валянціна ды Анатолій з кардона № 8». «Гэты незручны Пену». «Урокі музыкі».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Ад калтаса — да фермера».
19.40. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні.
20.00. «Веснавая элегія». Фільм-канцэрт.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Трэці тайм.
21.45. Дабрачынны аўкцыён бізнес-клуба «Партнёр».
21.50. «Жаба-царэўна». Мультфільм для дарослых.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
23.30. Ніка.
23.45. Дэбюты: Саюз кампазітараў Беларусі прадстаўляе...

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільмы «Паляўнічы», «Аквіро».
8.00. ...Да 16 і старэйшым.
8.40. «Жанчына ў капелюшы». Маст. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.20. Дак. фільм «Вораг па імені «агонь».
12.30. Канцэрт.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.25. «Трывожная нядзеля». Маст. фільм.
15.50. Канцэрт ансамбля песні і танца «Мары Эл».
16.20. «Спектакль на зададзеную тэму». Дак. фільм.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
18.15. «Тайна залатых туфлікаў». Мультфільм.
18.25. Фільм— дзецям. «Змій з Ленебергі» (Швецыя). 3-я серыя «Свята ў Катхульце».
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы
20.00. Навіны.
20.40. «Погляд», «Музагляд», «Такі», «Шоу-біржа», «Блюз у Расіі».
У перапынку (23.00) — Навіны.
0.15. «Фатограф». Тэлевізійны мастацкі фільм. 3 серыі «Дэрык».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.25. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.55. Вольны час. «Увага: здымаю!».
9.10. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.40. Студыя «Нотабене».
10.20. «Патрэбна драматычная актрыса». В. Васільева.
11.35. «Пачакайце, дзеткі...».
11.50. «Санта-Варбара». 33-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Музычны клас. «Дзеці для дзяцей... і дарослых».
15.45. Першы тайм.
16.00. Вольны час. «ТБ-атэлье».
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Сімфанічныя «гравюры» Кара Караева.
17.20. Паралелі.
17.55. М-трэст.
18.10. Так і жывём.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Праграма «Ключ».
19.45. «Прызнанне ў каханні». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
22.00. Весткі.
22.20. Залатая шпора.
23.05. Майстры. Уладзімір Ашкеназі.
23.55. Лясы.

НЕ ТРЭБА СТВАРАЦЬ ЗЛОДЗЕЮ РЭЖЫМ НАЙБОЛЬШАГА СПРЫЯННЯ

Гаворачы аб папярэджанні крадзяжоў з кватэр, хацелася б закрануць вашы ўзаемаадносіны з суседзямі. Сёння многія з нас не ведаюць, хто жыве за сцяной, паверхам вышэй ці ніжэй або нават на адной лесвічнай пляцоўцы. Між тым, такое знаёмства зусім не лишкодзіць. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што зусім незбавязкова сябраваць сем'ямі, завязваць цесныя і «не разлі вадой» адносіны. Дастаткова сабрацца аднойчы і цвёрда, раз і назаўсёды, дамовіцца аб парадку дзеянняў у выпадку, напрыклад, калі ў суседскай кватэры чуюцца шум, крыкі, гучаць чужыя галасы або калі на лесвічнай пляцоўцы стаіць падазроны незнаёмец, ці незнаёмыя людзі выносяць з пад'езда якія-небудзь рэчы (напрыклад, тэлевізар або магнітафон — вострадэфіцытныя сёння прадметы хатняга ўжытку і вельмі папулярныя ў кватэрных злодзеяў).

Такім чынам падобная рабочая сустрэча з вашымі суседзямі прынясе толькі карысць: вы цвёрда дамовіліся, што ў выпадку гэтых і іншых падобных сітуацый акажаце адзін аднаму дапамогу і абавязкова паведаміце аб падзеях у міліцыю па тэлефоне «02».

Вельмі важна выпрацаваць адначасова і сістэму вашых паводзін у пад'ездзе. Многія нашы пад'езды настолькі недагледжаныя і закінутыя, што лёгка могуць стаць (і становяцца!) месцам учынення злачынства. Вось некалькі нескладаных парад, выконваючы якія вы зможаце значна зменшыць небяспеку стаць ахвярай злачынства (грабяжу, разбою, згвалтавання і г. д.) у родным пад'ездзе. Найперш трэба паклапаціцца аб тым, каб пачынаючы з вечара і ўсю ноч ваш пад'езд асвятляўся электрычнасцю. У абстаноўцы ўсеагульнай безгаспадарчасці і безадказнасці, якія пануюць у нас сёння ўсюды, цяжка чакаць своечасовай замены лямпачкі ад работнікаў ЖЭС ці домакіраўніцтва — возьміце на сябе гэты нескладаны і не надта цяжкі матэрыяльна абавязак. Не палянуйцеся — ахавайце лямпачку плафонам або ахоўнай сеткай: так яна праслужыць значна даўжэй. Уваходзячы ў пад'езд, не расслабляйцеся поўнасцю, будзьце ўважлівымі, падрыхтуйцеся да розных нечаканасцей. Старайцеся пазбягаць сумеснай паездкі ў ліфце з незнаёмымі людзьмі, асабліва з маладымі мужчынамі, а таксама з п'янымі: лепш зрабіце выгляд, што дастаяце з паштовай скрынкі карэспандэнцыю або чакаеце сваіх знаёмых, якія затрымаліся на вуліцы, і папрасіце незнаёмца спусціць вам ліфт.

Мэтазгодна ключы ад уваходных дзвярэй падрыхтаваць загадзя і непрыкметна трымаць іх у руцэ. Увайшоўшы ў кватэру, не распранаючыся, адразу ж зачыніце дзверы на замкі.

Не лічыце дробяззю і час вынасу вамі бытавога смецця з кватэры. Як правіла, многія з нас, выносячы смецце і пакідаючы кватэру «на хвілінку», забываюць закрыць дзверы ў кватэры на ключ. Ад гэтай прывычкі лепш за ўсё пазбавіцца раз і назаўсёды. Акрамя таго, трэба прывучыць сябе выносіць смецце не позна ўвечары, а раніцай — гэта бяспечней.

Варта больш уважліва прыглядзецца і да кампаній падлеткаў, якія, магчыма, «акупіравалі» ваш пад'езд і сістэматычна збіраюцца ў ім. Сярод іх могуць аказацца і схільныя да злачынстваў, у тым ліку і крадзяжу з кватэр. Таму ў гэтых выпадках неабходна звярнуцца да вашага ўчастковага інспектара міліцыі і паведаміць яму аб з'явах, што адбываюцца ў вашым пад'ездзе — міліцыя зможа разабрацца з гэтай кампаніяй, установіць яе ўдзельнікаў, пасля чаго ўчыненне імі злачынства менавіта ў вашым доме — малаверагодна.

Калі ж, вярнуўшыся дамоў, вы ўбачылі, што ўваходныя дзверы ўзламаныя або адкрытыя, трэба не панікаваць і не ўпадаць у адчай, а аператыўна выканаць наступныя дзеянні:

— ні ў якім разе не ўваходзіць у кватэру;

— тэрмінова выклікаць міліцыю па тэлефоне «02» (акрамя тэлефона суседзяў можна скарыстаць і кнопку «выклік дыспетчара» ў кабіне ліфта — усе дыспетчары-ліфцёры праінструктаваны, што трэба рабіць у такіх выпадках);

— да прыбыцця міліцыі не ўваходзьце ў кватэру самі і не пускайце туды нікога, каб не былі знішчаны сляды, што, магчыма, пакінулі злачынцы;

— мэтазгодна блакіраваць кватэру з дапамогай суседзяў (з якімі ў вас, як памятаеце, існуе дамоўленасць аказваць адзін аднаму дапамогу і ўзаемавыручку ў падобных сітуацыях). Гэта дапаможа перашкодзіць злачынцам уцячы, калі яны ў момант вашага прыходу яшчэ знаходзяцца ў кватэры.

У любым выпадку добра запомніце два асноўныя правілы: да прыбыцця міліцыі ў кватэру нельга пускаць нікога з пабочных, нічога не чапаць і не перамяшчаць, не працираць і не дакранацца. Парушыўшы гэтыя нескладаныя правілы, вы рызыкуеце знішчыць сляды злачынцаў, парушыць карціну злачынства, што можа істотна перашкодзіць раскрыццю крадзяжу і выкрыццю зладзеяў.

І яшчэ аб адной, на жаль, распаўсюджанай сёння з'яве хацелася б сказаць. Гаворка ідзе аб запрашэнні ў сваю кватэру для сумеснай выпіўкі або сексуальных забаў наогул незнаёмых людзей. Такія знаёмствы завязваюцца, як правіла, на вуліцы ці ў рэстаране, кафэ, закусачнай, іншых падобных месцах. Пры ап'яненні мужчынская душа (у гэтых выпадках пацярпеўшымі выступаюць часцей за ўсё мужчыны) настойліва патрабуе працягу «знаёмства». І яно працягваецца ўжо ў кватэры, дзе навяваўленыя «сябры» ці «сяброўкі», цярпліва частуючы гаспадара, даводзяць яго да поўнага «адключэння», а затым бесперашкодна адбіраюць і выносяць найбольш каштоўныя рэчы. Толькі праз некаторы час працверазелы гаспадар заяўляе аб гэтым у міліцыю і просіць дапамогі. На жаль, супрацоўнікі міліцыі далёка не заўсёды ў такіх выпадках здольныя раскрыць злачынствы: учыняюць іх часам «гастралёры», якія прыехалі ў Беларусь здалёк і аб якіх пацярпеўшы нічога не ведае.

Хацелася б даць некалькі рэкамендацый і наконт таго, як больш надзейна зберагчы вашу асабістую маёмасць ад крадзяжу на рабоце. На жаль, менавіта тут адбываецца нямала крадзяжоў, аналіз абставін якіх дае магчымасць выдзеліць некалькі асноўных прычын, якія садзейнічаюць злачынству.

ЗБЕРАЖЫ СЯБЕ САМ

Часцей за ўсё крадуць каштоўныя рэчы з незакрытых на ключ службовых памяшканняў, асабліва з бальніц і паліклінік, пакояў выкладчыкаў, а кафедраў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, з дзіцячых садкоў, іншых устаноў. Трэба мець на ўвазе, што паласа суцэльных скарачэнняў закранула, у першую чаргу, вахцёраў, і таму настойліва рэкамендуем: пакідаючы службовыя кабінеты нават на некалькі хвілін (на практыцы яны часам зацягваюцца на гадзіны!), абавязкова закрывайце дзверы на ключ! Калі ключоў не хапае, то закажыце іх патрэбную колькасць у бліжэйшым Доме быту: лепш патраціць некалькі рублёў, чым пазбавіцца асабістай маёмасці на сотні і нават тысячы. Не трэба таксама пакідаць у службовым кабінеце нават на кароткі час наведвальніка, тым больш, калі ён вам незнаёмы. Пры тэрміновай неабходнасці пакінуць службовае памяшканне трэба папрасіць прабачэння ў наведвальніка і прапанаваць яму пачакаць у прыёмнай або ў калідоры да вашага вяртання, не забыўшыся, вядома, закрыць службовы кабінет на ключ.

Другая бяда — пакінутыя ў службовых памяшканнях адкрытыя вокны і форткі. Менавіта праз іх пранікаюць ва ўстановы начныя зламыснікі і бесперашкодна заваладваюць і дзяржаўнай маёмасцю, і асабістай. Адсюль парада: ідучы з работы, трэба абавязкова праверыць, ці добра закрыты ўсе вокны і форткі, найбольш каштоўныя рэчы схаваць у сейфы або незгаральныя скрыні. Дарэчы, аб сейфах: чамусьці многія работнікі ўстаноў узялі за правіла захоўваць ключы ад металічных сховішчаў у скрынях кабінетных сталоў. Майце на ўвазе, злодзей найперш абшукае ўсе службовыя сталы і, знайшоўшы ключы ад сейфаў ці скрынь, з задавальненнем імі пакарыстаецца. Дык не трэба ствараць яму рэжым найбольшага спрыяння.

Трэцяе правіла: заўважыўшы на ўстанове чалавека, які блукае без справы, пацікаўцеся, што яго сюды прывяло, не саромейцеся прамога пытання, зададзенага, як гаворыцца, «у лоб»: ён пачынае нерваваццa, блытаецца. У гэтым выпадку мэтазгодна з дапамогай саслужыўцаў затрымаць яго і неадкладна выклікаць міліцыю, якая дэталёва разбярэцца з асобай «наведвальніка» і прычынамі яго з'яўлення ва ўстанове. Зразумела, усё гэта павінна рабіцца ў вышэйшай ступені карэктна і з належнай вытрымкай.

Патрэбна і дакладная арганізацыя работы гардэробаў. Тут нярэдка адбываюцца крадзяжы адзення шляхам прад'яўлення гардэробшчыкам падробленых жэтонаў. Супрацоўнікі міліцыі штогод па некалькі разоў праводзяць адпаведныя інструктажы ва ўстановах і арганізацыях горада. Калі да гэтага дабавяцца зацікаўленыя і прынцыповыя адносіны да работы гардэробаў гаспадарчых кіраўнікоў, можна быць спакойнымі — зладзеі абламаюць зубы на нашых з вамі гардэробах і пакінуць іх.

Дарэчы, яшчэ адна парада, спецыяльна для гаспадарчых кіраўнікоў! Трэба вельмі старанна адносіцца да падбору кадраў гардэробшчыкаў, вахцёраў і, асабліва, вартаўнікоў! Ужо зафіксавана некалькі выпадкаў, калі на гэту работу афармляліся людзі... раней судзімыя за крадзеж(!). Яны ж потым замест аховы чужога дабра займаліся яго крадзяжом! Такія факты мелі месца ў некаторых сярэдніх школах, інтэрнатах прамысловых прадпрыемстваў, на платных ахоўваемых аўтастаянках.

Разумею, што на мізэрныя аклады гэтай катэгорыі работнікаў знайсці жадаючых сюды нялёгка, але і браць для выканання ахоўных функцый тых, у каго ліпкія рукі, — недапушчальна!

Валерый СТРАМБУРСКІ.

НА ДВОР'Е

16 красавіка

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца аблачнае з праяснеццямі надвор'е. Па паўночнаму захаду кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў Віцебску — 11—13, Гродна — 12—14, Брэсце, Магілёве і Мінску — 13—15, Гомелі — 16—18 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак чакаецца: 17 красавіка на большай частцы тэрыторыі рэспублікі, 18-га месцамі па рэспубліцы пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 17 красавіка 2—7 градусаў цяпла, 18 красавіка ад 1 градуса марозу да 4 градусаў цяпла, удзень 7—12 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Знаходжанне В. Кебіча ў Італіі.

«Шматаблічная эканоміка». Падборка пісьмаў.

Саюзная і рэспубліканская інфармацыя.

Сесія: дзень за днём.

«Як працуем, прафесар»? Праблема.

«Чытач — чытачу». Ад нашага галоўнага карэспандэнта.

«Кругагляд». Факты. Падзеі. Людзі.

«З нячыстай сілай дрэнныя жарты...» Пасля прэм'еры.

«Як з салоднага зрабіць горкае». Думка.

«Хочаце пятаць — тварыце». Расказ аб актрысе.

ЗДЫМУ

кватэру. Тэл. у Мінску 51-32-88.

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Іван Бараноўскі, намеснік адказнага сакратара Віктар Краўчанка, старшы карэктар Вікторыя Кляновік.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.784. Індэкс 63.850.
Зак. № 78.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12